ТАТЫ МОГУЦЬ БОЛЬШ. І ЗРОБЯЦЬ?

Сямейная

СЫШЛІСЯ І РАЗЫШЛІСЯ. ЧАМУ?

Сямейная

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

24 КАСТРЫЧНІКА 2019 г. ЧАЦВЕР № 203 (29070)

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый КАЛЕЧЫЦ, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка:

«Мабільны банкінг у краіне набірае папулярнасць — за І паўгоддзе сёлета колькасць карыстальнікаў павялічылася да чатырох мільёнаў (на 1 студзеня 2019-га яна склала 2,63 мільёна карыстальнікаў). Трэба меркаваць, колькасць іх будзе павялічвацца. Гэта з'яўляецца, па сутнасці, адлюстраваннем лічбавай трансфармацыі і змены мадэлі ўзаемадзеяння фінансавых устаноў і кліентаў. Найбольш папулярным каналам дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання застаецца інтэрнэт-банкінг. Па звестках на 1 ліпеня, да яго падключана 6 мільёнаў 726 тысяч карыстальнікаў. Сёння для фізічных асоб у аддаленым рэжыме даступна 73 % банкаўскіх паслуг, для юрыдычных асоб — 70 %. Плацежная сістэма Беларусі ў поўнай меры забяспечвае патрэбы рэальнага сектара і насельніцтва ў правядзенні разлікаў і прыёме плацяжоў».

КАРАТКА

- **У Брэсце пабудавалі электрадом, які поўнасцю адпавядае еўрапейскім стандартам энергаэфектыўнасці.**
- Сярэдзіна восені ў Беларусі выдалася самай цёплай за апошнія 75 гадоў.
- **Жыхар Мінска падарыў сталічнаму заапарку серабрыстую лісу.**

- У Гомельскай вобласці Дзяржстандарт выявіў недаважванні фасаванай прадукцыі.

ISSN 1990 - 763X

ВЫЗНАЧЫЦЬ АРЫЕНЦІРЫ І РУХАЦЦА НАПЕРАД

Фота БелТА.

Прэзідэнт Беларусі сустрэўся са сваім кубінскім калегам Мігелем Марыа Дыясам-Канелем Бермудэсам

Гэты візіт двойчы першы. Упершыню лідар Кубы наведвае Беларусь. І першы раз Вастраў Свабоды прадстаўляе менавіта Прэзідэнт. Такую пасаду ў краіне Лацінскай Амерыкі заснавалі па выніках канстытуцыйнай рэформы сёлета ў лютым. Новая канстытуцыя ўводзіць пасаду Прэзідэнта (зноў з 1976 года) і прэм'ер-міністра, у ёй таксама прызнаецца права прыватнай уласнасці. Але адным з асноўных прынцыпаў дзейнасці кубінскай дзяржавы застаецца будаўніцтва сацыялізму, а Камуністычная партыя па-ранейшаму — важная палітычная сіла.

Беларусь — гэта адзін з пунктаў вялікага еўрапейскага турнэ новага Прэзідэнта Кубы. У пачатку тыдня Мігель Дыяс-Канель ужо пабываў у Ірландыі, пасля перагавораў з беларускай сталіцы накіраваўся ў Баку на саміт Руху недалучэння. Завершыцца падарожжа лідара Кубы перагаворамі ў Маскве.

СТАР. 2

Малая радзіма

СЛЕД НА ЗЯМЛІ

Барысаўскі мецэнат вяртае роднаму гораду славу культурна-гістарычнага цэнтра

Уладзімір СЛЕСАРАЎ у рабочым кабінеце калекцыянера — у ім сабрана квінтэсенцыя таго, чым займаўся гаспадар сядзібы.

Паміж імі 150 гадоў, агульная малая радзіма — Барысаў і любоў да гісторыі. Першы — Іван Каладзееў, стацкі саветнік і камергер, саўладальнік запалкавай і папяровай фабрык, мільянер, які сабраў унікальную калекцыю рарытэтаў па гісторыі Айчыннай вайны 1812 года і яшчэ ў 1901-м за свае грошы паставіў героям вайны першыя памятныя знакі каля вёскі Студзёнка, садзейнічаў стварэнню музея на чыгуначнай станцыі Барадзіно. Другі — Уладзімір Слесараў, былы воін-інтэрнацыяналіст і сучасны прадпрымальнік, а таксама мецэнат, які ўзняў з нябыту сядзібу Каладзеева і зрабіў яе культурна-гістарычным аб'ектам. Сюды часта наведваюцца не толькі беларусы, але і турысты з Расіі, Францыі, Ізраіля, Германіі, ЗША і іншых краін — штогод прыязджае каля шасці тысяч чалавек.

СТАР. 13

Жыллё маё

ЯК ГАРАЧЫЯ ПІРАЖКІ

разышліся ўчасткі пад прыватныя дамы ў Смалявічах

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Калі будаўніцтва шматкватэрных дамоў у гарадах-спадарожніках толькі набірае абароты, «індывідуалка» выходзіць на новы ўзровень

У нашай краіне налета плануецца ўзвесці каля 4 мільёнаў квадратных метраў жылля (столькі ж — сёлета), з іх каля 44 % у індывідуальных жыллёвых дамах, паведаміла начальнік аддзела жыллёвага будаўніцтва ўпраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Кацярына УСЯНКОВА.

Будуем самі да 2 мільёнаў «квадратаў» у год

Больш за тое, толькі за восем месяцаў бягучага года ўведзена каля 1 мільёна «квадратаў» індывідуальнага жылля. Найбольш актыўна гэты кірунак развіваецца ў Брэсцкай і Мінскай абласцях. Начальнік аддзела заўважае, што за апошнюю пяцігодку адзначаецца стабільна высокі ўзровень індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва, калі такім чынам узводзіцца 1,75—1,8 мільёна квадратных метраў у год. Вызначанае ўрадам заданне (не менш за 40 % ад агульнай плошчы ўводу) выконваецца і нават рэгулярна перавыконваецца.

Галоўным чынам індывідуальнае жыллё будуецца ў сельскай мясцовасці — па выніках васьмі месяцаў з 4 тысяч дамоў на вёсцы ўведзена каля 2 тысяч аб'ектаў жыллёвага будаўніцтва. Кацярына Усянкова адзначыла, што ў апошні час атрымлівае развіццё індывідуальнае індустрыяльнае домабудаванне. Праекты распрацоўваюць прадпрыемствы домабудаўнічых камбінатаў, якія ёсць у кожнай вобласці.

СТАР. 4

ВЫЗНАЧЫЦЬ АРЫЕНЦІРЫ І РУХАЦЦА НАПЕРАД

АДДАНЫ СЯБАР МУЖНАЙ КУБЫ

Гэта ўжо не першы візіт Мігеля Дыяса-Канеля ў Беларусь. У 2016 годзе, займаючы пасаду намесніка старшыні Дзяржсавета і Савета міністраў, ён ужо наведваў нашу краіну і пазнаёміўся з Аляксандрам Лукашэнкам. Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што сачыў за падзеямі, якія апошнія два з паловай дзесяцігоддзі адбываліся на Кубе, і добра быў знаёмы з Фідэлем Кастра, аб сустрэчы з якім захаваў прыемныя ўражанні.

У Беларусі ўважліва назіраюць за рэфармаваннем эканамічнай і палітычнай сістэмы на Кубе. «Мы вельмі спадзяёмся, вельмі хочам, каб Куба, рэвалюцыйная, трывалая, мужная, была заўсёды паспяховай, а кубінцы былі багатымі людзьмі», — запэўніў Прэзідэнт.

Гісторыя беларуска-кубінскіх адносін мае трывалую базу. Таму Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу кубінскага калегі, што не трэба нічога выдумляць, а неабходна працягваць адносіны, выконваючы дамоўленасці. Ён акцэнтаваў увагу, што эканомікі дзвюх дзяржаў не канкуруюць. У нас ёсць неабходнасць купляць тое, што ствараюць кубінцы, а ў іх — тое, што вырабляюць у Беларусі. «Нам трэба сур'ёзна пагаварыць па гэтых пытаннях, вызначыць арыенціры і рухацца наперад», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Як адзначыў Прэзідэнт Кубы, новая сустрэча ў Мінску — яшчэ адна магчымасць абмеркаваць мінулыя дамоўленасці, развіваць эканамічнае, дыпламатычнае і гандлёвае супрацоўніцтва. «Беларусь — гэта адна з першых краін, якія я наведваю пасля майго выбрання на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Куба. Гэта шмат гаворыць аб тым прыярытэце, які мы надаём адносінам з вашай краінай», — звярнуў увагу Мігель Дыяс-Канель.

МІНСК І ГАВАНА: НАДЗЕЙНЫЯ САЮЗНІКІ

Аляксандр Лукашэнка на перамовах у пашыраным складзе з кубінскім калегам адзначыў, што такі візіт падкрэслівае цікавасць да нашай краіны як да надзейнага, праверанага партнёра і сябра.

«Хачу вас запэўніць, што кубінскі бок ніколі не будзе расчараваны супрацоўніцтвам з Беларуссю. Усё, пра што мы з вамі сёння дамовімся, будзе няўхільна выконвацца. Гавана з'яўляецца для нас надзейным саюзнікам у рэгіёне Лацінскай Амерыкі. Нашы краіны аб'ядноўваюць агульныя пункты гледжання па актуальных праблемах сучаснага свету і канструктыўная сумесная работа на розных міжнародных форумах», — падкрэсліў лідар Беларусі. Пры гэтым, адзначыў ён, Куба заўсёды была і застаецца для нас прыкладам мужнасці, стойкасці і вернасці сваім ідэалам.

Аляксандр Лукашэнка паведаміў гасцям, што ў Мінску з вялікай цікавасцю назіраюць за сістэмнымі палітычнымі пераўтварэннямі, якія праводзяцца ў іх краіне пры шырокай грамадскай падтрымцы. Прэзідэнт Беларусі ўпэўнены: новая Канстытуцыя, якая зафіксавала дасягненні Кубінскай рэвалюцыі, стане трывалай асновай устойлівага і дынамічнага развіцця дзяржавы на доўгія гады.

Сярод перспектыў беларуска-кубінскага супрацоўніцтва кіраўнік

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Фота БелТА.

Мігель Марыа Дыяс-Канель Бермудэс наведаў учора Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

дзяржавы адзначыў шэраг кірункаў. Традыцыйна важнай сферай узаемадзеяння дзвюх краін з'яўляецца сельская гаспадарка. «Мы гатовыя дзяліцца сваім перадавым вопытам, ведамі і тэхналогіямі, якія ўяўляюць для вас цікавасць. Гэта ў аднолькавай ступені датычыцца і прадукцыі сельскагаспадарчага машынабудавання, якая яшчэ з савецкіх часоў добра вядомая на Востраве Свабоды», — нагадаў Аляксандр Лукашэнка.

«Разумеючы важнасць беларускіх тавараў для Кубы, мы ў вельмі няпростых для нас умовах вырашылі пытанне аб выдзяленні крэдытаў для фінансавання паставак на максімальна выгадных умовах. Гэта дазволіла нам рэалізаваць шэраг сумесных цікавых праектаў», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Паміж нашай краінай і Кубай ужо адпрацаваны чарговыя кантракты на суму больш за трыццаць мільёнаў еўра. Прычым не толькі ў галіне сельскай гаспадаркі: падпісана пагадненне аб пастаўцы на Кубу беларускіх станкоў, абмяркоўваецца магчымасць стварэння сумеснай вытворчасці бытавой тэхнікі.

Даныя эканамічнай статыстыкі сведчаць аб тым, што магчымасці гандлю Беларусі і Кубы выкарыстоўваюцца далёка не ў поўнай меры. «Таму мы і прынялі з вамі рашэнне, што на кароткую перспектыву да наступнага майго візіту на Кубу, нашы прадстаўнікі ўрадаў распрацуюць дарожную карту, план дзеянняў», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Для далейшага руху наперад маецца ўсё неабходнае: развітая вытворчая база, перадавы вопыт, тэхналогіі, а таксама палітычная воля, паразуменне і падтрымка кіраўнікоў дзяржаў. «Упэўнены, што вынікі перамоў у Мінску будуць спрыяць развіццю разнапланавага беларуска-кубінскага дыялогу, дазволяць дасягнуць прынцыповых дамоўленасцяў аб нашым далейшым супрацоўніцтве», — канстатаваў беларускі лідар.

Мігель Дыяс-Канель запрасіў Прэзідэнта Беларусі на Кубу для далейшых перамоў па ўзаемадзеянні. Ён адзначыў, што Востраў Свабоды перажывае няпростыя часы з-за ўзмацнення эканамічнай блакады з боку ЗША. Таму лідар Кубы падзякаваў нашай краіне за падтрымку і ўключэнне гэтага пытання ў выступленне міністра замежных спраў Уладзіміра Макея на 74-й сесіі Генасамблеі ААН.

КРОК ДА ПАГЛЫБЛЕННЯ ПАРТНЁРСТВА

Падчас заявы для прадстаўнікоў СМІ па выніках перамоў з Мігелем Дыясам-Канелем Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Хацеў бы асабліва падкрэсліць: гэта першы ў гісторыі нашых сучасных двухбаковых адносін візіт кіраўніка кубінскай дзяржавы ў Беларусь. Для нас гэта важны крок у далейшым паглыбленні стратэгічнага партнёрства паміж Мінскам і Гаванай, пацвярджэнне таго, што вектар прыярытэтаў Кубы не зменіцца», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што перамовы тры гады таму дазволілі надаць адчувальны імпульс развіццю беларуска-кубінскіх адносін, якія, зрэшты, і раней былі ўзорнымі з пункту гледжання паразумення і ўзаемнага даверу.

«Сёння ўжо на вышэйшым узроўні мы абмеркавалі ўвесь комплекс пытанняў нашага двухбаковага парадку дня і выпрацавалі адпаведныя рашэнні на перспектыву. Гэта сустрэча пацвердзіла: у нашых краін ёсць выразная палітычная воля працягваць канструктыўнае і ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва, ажыццяўляць новыя сумесныя праекты на карысць нашых народаў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнты таксама адкрыта абмеркавалі сітуацыю ў свеце і ў рэгіёнах, пацвердзіўшы, што абедзве краіны падзяляюць падыходы адна адной па ключавых пытаннях глабальнага парадку дня. «Куба была і застаецца для нас стратэгічным партнёрам у Лацінскай Амерыцы і Карыбскім басейне. Агульнасць прынцыпаў знешняй палітыкі Мінска і Гаваны, такіх як раўнапраўе, неўмяшанне ва ўнутраныя справы суверэнных дзяржаў, непрыманне сілавых метадаў вырашэння рознагалоссяў, дазваляе нам канструктыўна ўзаемадзейнічаць на міжнародных пляцоўках. Пры гэтым выдатныя палітычныя адносіны паміж нашымі краінамі дапаўняюць супрацоўніцтва ў сферах адукацыі і навукі, якое дынамічна развіваецца», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

На яго думку, абедзве дзяржавы надаюць прыярытэтнае значэнне прасоўванню інфармацыйных тэхналогій. З улікам сур'ёзнай адміністрацыйнай базы, якая сфарміравана і паспяхова прымяняецца ў Беларусі, прэзідэнты абмяняліся думкамі аб магчымасцях перадачы беларускага перадавога досведу кубінскім сябрам.

«Мы дамовіліся і далей займацца мадэрнізацыяй і рамонтам сельгастэхнікі на Кубе. А яе нямала», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка. За апошнія гады Беларусь і Куба прапрацавалі новыя, цікавыя для абодвух бакоў праекты. Гэта, напрыклад, установка на Кубе станочнага абсталявання беларускай вытворчасці, стварэнне сумеснай вытворчасці бытавой тэхнікі. У гасцей ёсць намер развіваць электратранспарт. Кубінцы зацікавіліся айчыннымі электробусамі. У галіне аховы здароўя — перспектыўнае супрацоўніцтва ў кардыялогіі, магчымае стварэнне ў Беларусі сумеснай клінікі. Нягледзячы на пэўныя палітычныя складанасці, Куба штогод прымае мільёны турыстаў. І тут яшчэ адзін магчымы вектар партнёрства па абмене вопытам. Інтарэсы Беларусі і Кубы супадаюць таксама ў навукова-тэхнічнай сферы, сумесных даследаваннях, біятэхналогіях, фармацэўтычнай прамысловасці, інавацыях, адукацыі, спорце.

«У сваю чаргу наша краіна выкарыстоўвае перадавую і вядомую ва ўсім свеце прадукцыю біяфармацэўтычнай галіны Кубы. Абмяркоўваецца магчымасць пашырэння наменклатуры лекавых сродкаў, якія пастаўляюцца нам з Кубы, перадачы тэхналогій для іх вытворчасці на беларускіх магутнасцях», — расказаў Прэзідэнт Беларусі.

«Мы выпрацавалі таксама сумесныя рашэнні, якія дадуць магчымасць у найбліжэйшай будучыні вывесці аб'ёмы двухбаковага гандлю на ўзровень, належны стратэгічным партнёрам. І мы гэта можам зрабіць. Толькі не трэба спасылацца на аб'ектыўныя і суб'ектыўныя складанасці. Яны былі, ёсць і будуць заўсёды, і на Кубе, і ў Беларусі, і ў іншых дзяржавах. Мы для таго і існуём, каб пераадолець гэтыя складанасці. Аб гэтым мы перадусім дамовіліся з Прэзідэнтам Кубы», — канстатаваў беларускі лідар.

Ён падзякаваў за запрашэнне на Кубу і адзначыў, што прыедзе, як толькі будзе выпрацавана карта ўзаемадзеяння на кароткі тэрмін і пачнецца яе выкананне.

РАЗАМ КРАІНЫ МОГУЦЬ БОЛЬШ

Падчас афіцыйнага візіту прэзідэнты абедзвюх дзяржаў падпісалі сумесную заяву, у якой адзначылі адкрыты і канструктыўны характар развіцця двухбаковых адносін, пацвердзілі намер іх паглыблення. У заяве таксама адзначаецца, што бакі будуць падтрымліваць намаганні, накіраваныя на ўмацаванне міжнароднага міру і стабільнасці, і падкрэсліваецца вялікая важнасць далейшага развіцця палітычнага дыялогу паміж дзвюма краінамі.

Падпісаны і шэраг двухбаковых дакументаў: мемарандум аб узаемаразуменні паміж двума міністэрствамі юстыцыі, праграма развіцця супрацоўніцтва краін у сферы вышэйшай адукацыі на 2019—2021 гады, выканаўчая праграма беларуска-кубінскага навукова-тэхнічнага і інавацыйнага супрацоўніцтва на 2020—2022 гады, пагадненне паміж Беларускім тэлеграфным агенцтвам і Лацінаамерыканскім інфармацыйным агенцтвам аб абмене інфармацыяй.

Сустрэча завяршылася падарункамі. Аляксандр Лукашэнка уручыў кубінскаму калегу эксклюзіўны набор шакаладу і карціну «Малады Хасэ Марці». Хасэ Марці, лідар вызваленчага руху за суверэнітэт Кубы, на радзіме лічыцца нацыянальным героем, «апосталам незалежнасці». Па традыцыі Прэзідэнт Кубы пасадзіў дрэва на Алеі пачэсных гасцей на тэрыторыі Палаца Незалежнасці.

Марыя ДАДАЛКА, Варвара МАРОЗАВА.

РОДНАЯ МОВА — БЕЛАРУСКАЯ

Прэзідэнт прыняў удзел у перапісе насельніцтва

Прэс-сакратар кіраўніка дзяржавы Наталля Эйсмант расказала карэспандэнту БелТА, што Аляксандр Лукашэнка запоўніў перапісныя лісты і перадаў іх у Белстат.

«Аб важнасці гэтай маштабнай акцыі для далейшага развіцця краіны гаварыць залішне. Таму Прэзідэнт, безумоўна, не застаўся ад яе ўбаку. Удзел у перапісе кіраўнік дзяржавы прыняў яшчэ на мінулым тыдні», — адзначыла Наталля Эйсмант. Яна таксама адказала на папулярнае пытанне наконт моўнай часткі. У прыватнасці, на якой мове Прэзідэнт запаўняў анкету і якую абазначыў у графе «родная мова».

«Тут усё проста: запаўняў анкету Прэзідэнт на рускай мове, у графе «родная мова» (засвоеная першай у раннім дзяцінстве) указаў беларускую», — паведаміла прэс-сакратар.

Варвара МАРОЗАВА.

Карыснае супрацоўніцтва

АДНОСІНЫ ПАМІЖ БЕЛАРУССЮ І АЎСТРЫЯЙ РАЗВІВАЮЦЦА ДЫНАМІЧНА

Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку накіравана афіцыйнае запрашэнне Прэзідэнта Аўстрыі наведаць Вену сёлета ў лістападзе. Аб гэтым расказала Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Аўстрыі ў Беларусі Алаізія Вёргетэр падчас гутаркі з журналістамі ў Нацыянальным прэс-цэнтры Беларусі.

— Дэталі візіту яшчэ абмяркоўваюцца, пра іх грамадскасць будзе апавешчана пазней, — зазначыла пасол.

Алаізія Вёргетэр расказала, што сама яна мела гонар арганізоўваць тры візіты высокага ўзроўню сёлета: у прыватнасці, у Беларусь Федэральнага прэзідэнта Аўстрыі Аляксандра Ван дэр Белена, міністра замежных спраў Карын Кнайсль, а таксама Себасцьяна Курца, які на той момант з'яўляўся Федэральным канцлерам Аўстрыі.

— Кантакты такога высокага ўзроўню дапамагаюць адкрытасці, камунікацыі, гатоўнасці да дыялогу і на рабочым, і на аператыўным узроўні, — дадала пасол. — Паміж нашымі краінамі запланавана мноства візітаў. Складваецца вельмі сардэчны, карысны для абодвух бакоў абмен на ўсіх ступенях развіцця зносін.

На працягу года беларуска-аўстрыйскае супрацоўніцтва развівалася асабліва дынамічна. Гэта адлюстроўваецца і ў лічбах узаемнага тавараабароту. За першае паўгоддзе экспарт з Аўстрыі склаў 50 мільёнаў еўра, імпарт —- каля 10 мільёнаў еўра. У цэлым прырост тавараабароту ў памеры 15 %, які дазваляе чакаць добрай дынамікі ў 2019 годзе.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

ПРА ВЫБАРЫ І НЕ ТОЛЬКІ

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА ўчора ў рамках адзінага дня інфармавання сустрэлася з калектывам Цэнтральнага ўнівермага «Мінск». Удзел службовых асоб у падобных мерапрыемствах ужо стаў традыцыяй у нашай краіне, паколькі дазваляе ўдзельнікам наўпрост пачуць пра палітыку дзяржавы на сучасным этапе, а таксама даведацца меркаванні людзей адносна пытанняў, якія іх хвалююць.

Фота БелТА.

Гэтая сустрэча з супрацоўнікамі ЦУМа была прысвечана тэме «Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь — прадстаўнічы і заканадаўчы орган беларускай дзяржавы». Гаварылі аб маючых адбыцца парламенцкіх выбарах, значнай ролі і значэнні Нацыянальнага сходу ў сістэме дзяржкіравання, у цэлым жыцці краіны.

Наталля Качанава заклікала кожнага прыйсці на выбарчыя ўчасткі і зрабіць свой выбар. Яна адзначыла, што Прэзідэнт выказваўся за тое, што ў парламенце патрэбныя людзі розных узростаў, прафесій, якія б прадстаўлялі розныя слаі грамадства.

Таксама на сустрэчы кіраўнік Адміністрацыі акрэсліла асноўныя крытэрыі работы для кіраўнікоў усіх узроўняў і, мабыць, кожнага чалавека. «Гэта перш за ўсё людзі, справядлівае да іх стаўленне і ўвага. Усе рашэнні, што прымаюцца, павінны быць на карысць людзей і дзяржавы», — нагадала яна пазіцыю Прэзідэнта.

Працягваючы размову пра палітыку Беларусі, Наталля Качанава назвала галоўнымі яе каштоўнасцямі незалежнасць і суверэнітэт. «Гэта непарушнае правіла, чырвоная рыса, за якую нельга пераступаць. Усё, чаго дасягнула Беларусь за невялікі прамежак незалежнай гісторыі, дарагога варта. Мы абавязаны гэта зберагчы, каб наступныя пакаленні маглі прымножыць і захаваць тое, што мы маем», — адзначыла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Супрацоўнікі ЦУМа задалі кіраўніку Адміністрацыі шмат пытанняў, закранулі эканоміку, адукацыю, ахову здароўя. Пазней у гутарцы з журналістамі Наталля Качанава прызналася, што для службовых асоб вельмі важна, каб людзі заўсёды актыўна ўдзельнічалі ў размове, бо зваротная сувязь дапамагае ў прыняцці кіраўніцкіх рашэнняў.

Сустрэча працягвалася больш за дзве гадзіны.

Паводле БелТА.

ПАСПРАЧАЕМСЯ ЗА ЛІДАРСТВА

Беларусь і Латвія працягваюць актыўную падрыхтоўку да чэмпіянату свету

Нагадаем, права сумеснага правядзення турніру ў 2021 годзе краіны атрымалі на гадавым кангрэсе ІІХФ у маі 2017 года.

На гэтым тыдні ў федэрацыі хакея Беларусі прайшла сустрэча з паслом Латвіі ў Беларусі Эйнарсам Семанісам.

Старшыня Беларускай федэрацыі хакея Генадзь САВІЛАЎ і Эйнарс СЕМАНІС.

У ходзе сустрэчы абмяркоўваліся пытанні візавай падтрымкі і трансгранічнага перамяшчэння балельшчыкаў і іншых кліенцкіх груп чэмпіянату. Нагадаем, сусветны форум пройдзе з 7 да 23 мая 2021 года. У Мінску і Рызе каманды паспрачаюцца за лідарства на групавым этапе, а таксама вызначаць удзельнікаў паўфіналаў. Матчы топ-4, фінал і гульню за «бронзу» прыме Мінск.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

«ГАЛАСАВАННЕ» Ў СМАРТФОНЕ

Мабільная версія гульні «Галасую!», распрацаваная актывістамі Мінскай гарадской арганізацыі БРСМ і прэзентаваная шырокай публіцы на рэспубліканскім семінары-трэнінгу «Беларусь і Я», стала даступная карыстальнікам платформаў Android, а ў хуткім часе з'явіцца яе iOS-версія.

Каб трапіць на выбарчы ўчастак і прагаласаваць, галоўны герой гульні праходзіць некалькі ўзроўняў. Адзін нагадвае яму пра тое, што, збіраючыся на выбары, неабходна ўзяць з сабой дакумент, які сведчыць асобу. Акрамя таго распрацоўшчыкі паклапаціліся і пра тое, каб ён не забыўся паесці і цёпла апрануцца. Па дарозе да выбарчага ўчастка звычайныя жыхары сталіцы прапануюць яму прайсці некалькі квэстаў. Яшчэ ён можа здзейсніць добрую справу, напрыклад, выратаваць кошку. Трэці ўзровень звязаны непасрэдна з выбарчай працэдурай.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДРУГОЕ «ЗОЛАТА» Ў КІТАІ

Перамогу на Сусветных ваенных гульнях атрымала наша жаночая зборная ў камандным турніры па класічным луку.

У вырашальным матчы Карына Дзямінская, Карына Казлоўская і Аляксандра Куратнік выйгралі ў саперніц з Расіі — 6:2. Трэцяе месца занялі спартсменкі КНДР, якія перамаглі ў матчы за «бронзу» ўкраінак — 5:3. Нагадаем, гэта другі залаты медаль беларускіх спартсменаў на турніры, раней найлепшым стаў дзюдаіст Даніэль Мукетэ. Акрамя залатых узнагарод, «серабро» і «бронзу» на Сусветных ваенных гульнях у Кітаі заваявалі барцы Аляксандр Гуштын і Ксенія Станкевіч адпаведна. Сусветныя ваенныя гульні будуць працягвацца да 27 кастрычніка.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

МУЛЬТЫМЕДЫЯ + ІНТЭРАКТЫЎ

На эканамічным факультэце БДУ адкрылі мультымедыйную «аўдыторыю будучыні». Яна дазваляе выкарыстоўваць у навучальным працэсе найноўшыя інтэрактыўныя тэхналогіі. Гэта ўклад БПБ-Ашчадбанка ў падрыхтоўку будучых фінансістаў.



У аўдыторыі арганізавана 48 пасадачных месцаў для студэнтаў. Спецыяльныя сталы-трансформеры дазваляюць лёгка змяняць расстаноўку мэблі, каб праводзіць лекцыі, семінары, круглыя сталы або дзелавыя гульні. А з дапамогай мультымедыйнага абсталявання тут могуць праходзіць інтэрактыўныя заняткі і мерапрыемствы.

У аўдыторыі будуць навучацца студэнты спецыяльнасці «Фінансы і крэдыт». Многія яе выпускнікі пасля заканчэння вучобы працаўладкоўваюцца ў банках.

Стварэнне «аўдыторыі будучыні» стала часткай доўгатэрміновага праекта, у рамках якога раней былі мадэрнізаваныя аўдыторыі ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце, Ліцэі БДУ і рэгіянальных школах.

Надзея НІКАЛАЕВА.

КАРЦІНА СА... ЗБРОІ ЧАСОЎ ВАЙНЫ

Увечары ў Мазырскі РАУС звярнулася мясцовая жыхарка. Яна паведаміла пра канфлікт са сваім сужыцелем у адной з кватэр дома па бульвары Юнацтва.

Па прыбыцці на месца здарэння супрацоўнікаў чакаў незвычайны сюрпрыз. На сцяне вісела карціна, зробленая з частак зброі.

Як патлумачыў 43-гадовы мужчына, каля дзесяці гадоў таму ён выкапаў арсенал на прысядзібным участку, што каля станцыі Галявіцы Калінкавіцкага раёна. З затвора вінтоўкі, штыка, часткі ўдарна-спускавога механізма (як мяркуецца, ад вінтоўкі Мосіна), ствала вінтоўкі і ручной гранаты Ф-1 з запалам ён і зрабіў «твор мастацтва» і павесіў на сцяну. Для гэтага нават адпілаваў частку гранаты, каб было зручней мацаваць, паведамілі ва УУС Гомельскага аблвыканкама.

У кватэры таксама былі выяўлены каска часоў Вялікай Айчыннай вайны, патроны і гільза. Усе боепрыпасы канфіскаваны для правядзення экспертызы. Мазырскім РАУС па гэтым факце праводзіцца праверка.

АЛКАМАРАФОН ЗА $6000

У Наваполацкі ГАУС звярнуўся мясцовы жыхар 1991 года нараджэння. Ён паведаміў, што неўстаноўлены злачынец здзейсніў крадзеж сумкі, у якой знаходзілася 11 000 долараў ЗША і 500 рублёў.

Праваахоўнікам удалося знайсці падазранага і ўзнавіць падзею. Высветлілася, што пацярпелы з буйной сумай грошай, якая, паводле яго слоў, павінна была пайсці на арганізацыю вяселля і набыццё жылля, распіваў спіртныя напоі. Як паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама, застолле для яго завяршылася ноччу ў пастарунку. Раніцай пасля вызвалення ён з выпадковымі знаёмымі вырашыў працягнуць свята. Утвораная тройца некалькі разоў хадзіла па спіртное. Апошні сумесны паход на запраўку скончыўся тым, што пацярпелы паставіў сумку з грашыма на зямлю, а адзін з яго наваспечаных прыяцеляў забраў яе.

Увайшоўшы ў стан алкагольнага ап'янення, пацярпелы стаў хадзіць па тэрыторыі АЗС і пасля званка ад работнікаў запраўкі ў міліцыю зноў адправіўся ў пастарунак. А выкрадальнік з трэцім удзельнікам кампаніі сталі траціць чужыя грошы. Толькі працверазеўшы, новапалачанін звярнуўся ў міліцыю з заявай аб знікненні сродкаў. Супрацоўнікі крымінальнага вышуку затрымалі падазраванага ў крадзяжы. Ім аказаўся непрацуючы мясцовы жыхар 1988 года нараджэння. Ён з прыяцелем ужо паспеў патраціць большую частку скрадзенага. Праваахоўнікі канфіскавалі толькі 4800 долараў. Заведзена крымінальная справа за крадзеж.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

На паўднёвым усходзе Вялікабрытаніі ў грузавым кантэйнеры знойдзены 39 цел

У брытанскім Эсэксе ў грузавым кантэйнеры знойдзены целы 39 чалавек, паведамляе BBC.

Удакладняецца, што паліцэйскія Эсэкса былі выкліканыя ў прамысловы парк Waterglade ў Грэйсе 23 кастрычніка каля дзвюх гадзін ночы. Яны знайшлі ў кантэйнеры грузавіка целы 38 дарослых і аднаго падлетка. Іх асобы высвятляюцца.

Кіроўца грузавіка, 25-гадовы мужчына з Паўночнай Ірландыі, быў арыштаваны па падазрэнні ў забойстве, цяпер ён знаходзіцца пад вартай.

Паводле папярэдняй інфармацыі, грузавік прыбыў з Балгарыі і заехаў у краіну 19 кастрычніка. Месца знаходкі ачэплена, прамысловы парк Waterglade зачынены. Высвятляюцца ўсе абставіны надзвычайнага здарэння.

Прэзідэнт Чылі аб'явіў аб шэрагу мер сацыяльнай падтрымкі на фоне пратэстаў

Урад Чылі накіруе на разгляд парламента шэраг мер сацыяльнай падтрымкі для ўрэгулявання сітуацыі з пратэстамі і беспарадкамі, якія працягваюцца у рэспубліцы з мінулага тыдня. Пра гэта заявіў прэзідэнт Чылі Себасцьян Піньера.

«Мы перададзім на разгляд кангрэса гэты сацыяльны пакет у адпаведнасці з законам і пачнём яго рэалізацыю, калі ўрад атрымае гэтую магчымасць», — сказаў ён.

Паводле слоў прэзідэнта, у пакет мер уваходзіць павышэнне пенсій, зніжэнне тарыфаў на электрычнасць, частковае пакрыццё выдаткаў на лячэнне, зніжэнне цэн на лекі і ўстанаўленне мінімальнага гарантаванага даходу для працоўных.

Акрамя таго, урад Чылі плануе накіраваць у парламент законапраект аб павышэнні падатку для асоб з высокімі даходамі. Па словах Піньеры, гэтая мера дазволіць «павялічыць падатковыя паступленні ў бюджэт і прафінансаваць сацыяльную праграму».

Пратэсты, якія перараслі ў беспарадкі і сутыкненні з паліцыяй, пачаліся ў Сант'яга 14 кастрычніка, пасля таго, як кошт праезду ў метро ў сярэднім вырас на 30 песа ($0,04). Пазней беспарадкі ахапілі і іншыя гарады краіны. У сувязі са складанай сітуацыяй прэзідэнт Піньера абвясціў надзвычайнае становішча ў сталіцы і шэрагу іншых гарадоў, а таксама прыняў рашэнне адмяніць павышэнне цэн на праезд у грамадскім транспарце. Па звестках уладаў, у ходзе беспарадкаў загінулі 15 чалавек.

ЗША хочуць, каб у высадцы на Месяц удзельнічалі і іншыя краіны

Злучаныя Штаты хочуць, каб у іх праграме па асваенні Месяца Artemis удзельнічалі міжнародныя партнёры, у тым ліку тыя краіны, якія цяпер працуюць разам з NASA на Міжнароднай касмічнай станцыі. Пра гэта заявіў дырэктар Нацыянальнага ўпраўлення па аэранаўтыцы і даследаванні касмічнай прасторы Джэймс Брайдэнстайн, выступаючы на 70-м Міжнародным астранаўтычным кангрэсе ў Вашынгтоне.

«Мы хочам бачыць астранаўтаў усіх краін на паверхні Месяца, гэта наша мэта. Па меры таго, як мы рухаемся наперад, нам трэба будзе як мага больш міжнароднай падтрымкі», — сказаў ён.

NASA вясной аб'явіла аб тым, што новая праграма асваення Месяца атрымала назву Artemis. Яна будзе складацца з трох этапаў: першы прадугледжвае непілатуемы палёт устаноўленага на цяжкай ракеце карабля Orion вакол Месяца і яго вяртанне на Зямлю, гэты этап запланаваны на другую палову 2020 года. Другі этап — аблёт натуральнага спадарожніка Зямлі з экіпажам на борце, ён намечаны на 2022 год. На трэцім этапе NASA разлічвае ажыццявіць высадку астранаўтаў на Месяц у 2024 годзе.

ЯК ГАРАЧЫЯ ПІРАЖКІ

Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

Яны жадаюць жыць ва ўласным доме

Па падліках спецыялістаў, больш за 60 тысяч чалавек у нашай краіне стаяць у чарзе на атрыманне зямельных участкаў для будаўніцтва жылля, з іх 58 тысяч грамадзян — тыя, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Па звестках на 1 кастрычніка, у пераліку свабодных участкаў па краіне значацца землі агульнай плошчай 11 тысяч гектараў. Але гэта далёка не тое, чаго хочуць самі «чаргавікі». Нам бы «казырныя» ўчасткі паблізу ад сталіцы або абласных цэнтраў.

Кацярына Усянкова адзначыла, што кошт квадратнага метра пры ўзвядзенні прыватных дамоў атрымліваецца розны. Усё залежыць ад плошчы, ад матэрыялаў, аздаблення і ўзроўню добраўпарадкавання. Калі казаць аб праектах індустрыяльнага домабудавання, то ёсць прыклады ў Гомельскай вобласці, калі квадратны метр каштуе да 600 рублёў (гаворка ідзе пра «каробку» з вокнамі і дахам без аздаблення і добраўпарадкавання). Усё залежыць ад індывідуальных пажаданняў і ўзроўню даходу прыватнага кліента.

Спадарыня Усянкова заўважыла, што ў апошні час вялікая ўвага надаецца ўзвядзенню індывідуальнага жылля для шматдзетных сем'яў. Каля пяці тысяч іх ужо атрымалі ўчасткі асобных дамоў. Чакаецца, што сёлета ўзвядуць дамы каля тысячы такіх сем'яў.

Намеснік старшыні Камітэта архітэктуры і будаўніцтва Мінаблвыканкама, галоўны архітэктар Мінскай вобласці Вадзім НІКАЛАЕНКА дадаў, што каля 30 тысяч грамадзян прэтэндуе на зямельныя ўчасткі ў сталічным рэгіёне. З іх 17 тысяч — жыхары Мінска. Акрамя таго, ён заўважыў, што ў Мінскай вобласці за 10 гадоў выдзелена больш за 30 тысяч зямельных участкаў пад аднакватэрныя і блакаваныя жылыя дамы, у тым ліку каля 24 тысяч — тым, хто знаходзіцца на ўліку. На аўкцыёнах прададзена шэсць тысяч участкаў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Варта адзначыць, што ў сталічным рэгіёне індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва пераважае. У 2019 годзе вобласці даведзена заданне па ўводзе 1 мільёна 115 тысяч квадратных метраў жылля, з якіх 800 тысяч «квадратаў» (больш за 70 %) — аднакватэрныя і блакаваныя дамы.

Карэкціроўка развіцця Смалявіч, Рудзенска і Фаніпаля

Так, горад Мінск не гумовы. «Ёсць аб'ектыўная неабходнасць у абмежаванні жыллёвага будаўніцтва ў межах МКАД. У сувязі з тым, што атрымаць жыллё ў рэгіёне зацікаўленыя многія мінчане, аблвыканкам шукае вольныя тэрыторыі пад забудову ў гарадах-спадарожніках», — расказаў намеснік старшыні камітэта архітэктуры і будаўніцтва.

Пры гэтым ён дадаў, што ёсць выразная ўстаноўка не закранаць землі сельгаспрызначэння, развіваць існуючыя населеныя пункты. А ў Мінску, па падліках экспертаў, можна яшчэ пабудаваць не больш за 2,5 мільёна квадратных метраў жылля. Таму вырашана пакінуць пустыя ўчасткі, якія будуць выкарыстоўвацца наступнымі пакаленнямі.

У гарадах-спадарожніках Мінска зробяць акцэнт на забудове паніжанай павярхавасці. Такі падыход плануецца закласці ў абноўленыя генеральныя планы населеных пунктаў. Таксама прапануецца разам з будаўніцтвам жылля для мінчан-чаргавікоў фарміраваць участкі для выстаўлення на аўкцыёны. «Такія задачы пастаўлены перад распрацоўшчыкамі дакументацыі», — адзначыў Вадзім Нікалаенка.

Паводле слоў спецыяліста, для прылеглых да сталіцы пляцовак перспектыўным кірункам можа стаць узвядзенне комплексаў, у тым ліку па ўдасканаленні сацыяльнай, транспартнай інфраструктуры. «Гарады-спадарожнікі павінны быць прывабныя для жыцця, навошта гнацца за высокай паверхавасцю», — заўважыў ён. У прыклад спецыяліст прывёў развіццё мікрараёна Паўночны Захад у Смалявічах, дзе закладзены першы дом для мінчан. Працэс забуксаваў, тады як участкі для індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва разышліся «як гарачыя пірожкі».

«Людзі хочуць жыць у індывідуальным жыллі, і трэба даць ім такую магчымасць, каб гарады развіваліся не толькі за кошт бюджэту, але і за кошт пазабюджэтных крыніц. Вялікая колькасць камерцыйных забудоўшчыкаў з Мінска гатовая прыйсці на аўкцыёны. Таму мы хочам пры карэкціроўцы генплана падрыхтаваць прапановы па ўчастках», — сказаў Вадзім Нікалаенка.

Тэма развіцця гарадоў-спадарожнікаў ва ўмовах скарачэння жыллёвага будаўніцтва ў межах МКАД становіцца ўсё больш актуальнай. Згодна з генпланам Мінска, колькасць жыхароў сталіцы не павінна перавысіць два мільёны чалавек. Жыллё для мінчан прапануецца будаваць у першую чаргу ў Рудзенску і Смалявічах. Чакаецца, што насельніцтва гарадскога пасёлка Рудзенск вырасце на 70 тысяч (да 81 тысячы чалавек), Дзяржынска — на 18 тысяч (да 41 тысячы), Смалявіч — на 14,5 тысячы (да 30 тысяч чалавек). Павялічыцца колькасць жыхароў таксама ў Заслаўі, Фаніпалі і Лагойску.

Таўнхаусы ў Ратамцы, Бараўлянах і Хацежыне

Праекты па стварэнні такога еўрапейскага жылля рэалізуюць у Мінскай вобласці. Гэты кірунак у бліжэйшыя гады будзе актыўна развівацца. Таўнхаус — дом на некалькі кватэр без агульнага пад'езда — з асобнымі ўваходамі. Пад такую забудову сфарміраваны ўчасткі ў Ратамцы, Бараўлянах, Хацежыне ды іншых населеных пунктах. Пляцоўкі прапануюць забудоўшчыкам для наступнага продажу пабудаванага жылля грамадзянам.

Акрамя таго Салігорскі домабудаўнічы камбінат распрацаваў некалькі праектных рашэнняў (на тры і пяць пакояў — 96 і 128 квадратных метраў адпаведна) для ўзвядзення дамоў у індустрыяльным выкананні. Гэтыя дамы аптымальныя па структуры і метражы, таму яны запатрабаваныя грамадзянамі. Ужо заключана сем дагавораў. Кошт квадратнага метра складае каля адной тысячы рублёў за «каробку» без аздаблення з унутранымі інжынернымі сеткамі. Знешнія інжынерныя сеткі, агароджы, добраўпарадкаванне, гаражы — дадатковыя выдаткі. Па факце ў кожнай дамове сума вагаецца ў межах 1,2—1,3 тысячы рублёў за квадратны метр у залежнасці ад пажаданняў заказчыка.

Праекты з'яўляюцца тыпавымі. Пры неабходнасці праектнае бюро Салігорскага ДБК праводзіць іх карэкціроўку. Будаўніцтва вядзецца па Указе № 240 — з дзяржпадтрымкай і прыцягненнем ільготных крэдытаў. Аб'ём крэдытавання з'яўляецца арыенцірам у вызначэнні цаны. Таксама на суму ўплываюць віды работ, працягласць інжынерных сетак, адлегласць да аб'екта.

«Мы працуем і над новымі праектамі. У прыватнасці, зробленая перадпраектная прапрацоўка стварэння на базе салігорскіх канструкцый таўнхаусаў. Іх плануем прымяняць у перспектыўнай забудове ў Салігорску (уздоўж трасы Салігорск — Старобін)», — дадаў Вадзім Нікалаенка.

Спецыяліст падкрэсліў, што таўнхаусы для рэгіёна — цікавая тэма. Першыя такія аб'екты ўжо пабудаваныя сёлета ў Астрашыцкім Гарадку. «На мой погляд, атрымалася досыць нядрэнна. Бачым, што людзі засталіся задаволеныя жыллём. Такі падыход мае свае плюсы: на адным участку можна больш кампактна размясціць дамы, сэканоміць на даўжыні інжынерных камунікацый, за кошт заблакаваных сцен паменшыць цепластраты». У найбліжэйшы час падобныя аб'екты з'явяцца таксама ў Смалявічах — два зямельныя ўчасткі выдзелены МАПІДу. Зацікаўлены ў такім будаўніцтве і прыватныя забудоўшчыкі.

Сяргей КУРКАЧ.

У тэму

У Беларусі 38,1 % агульнага аб'ёму ўведзенага ў студзені—верасні жылля прызначана для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў.

Арганізацыі ўсіх формаў уласнасці пабудавалі 29,7 тысячы новых кватэр, уведзена ў эксплуатацыю 2 мільёны 603,7 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля. Для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 992 тысячы квадратных метраў. З агульнага аб'ёму ўведзенага жылля для чаргавікоў з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі пабудавана 689,6 тысячы «квадратаў». У сельскіх населеных пунктах уведзена ў эксплуатацыю 856,2 тысячы квадратных метраў жылля, або 32,9 % агульнай колькасці па краіне.

Факт

СІМВАЛІЧНАЯ ЗНАХОДКА

Медаль за ўдзел у перапісе насельніцтва 1897 года знайшлі ў Шумілінскім раёне

У рукі жыхара вёскі Навікі Анатоля Красіцкага нядаўна трапіла сімвалічная знаходка — медаль «За намаганні па першым усеагульным перапісе насельніцтва», які праводзілі ў Расійскай імперыі ў 1897 годзе, паведамляе карэспандэнт БелТА.

Анатоль Красіцкі — мясцовы калекцыянер, яго ведае шмат хто ў раёне, таму і нясуць мужчыну розныя знаходкі. Рарытэтны медаль адкапалі падчас карчавання саду, рэч добра захавалася.

«Значкі, медалі, манеты калекцыяную даўно. Некалькі разоў пачынаў і закідваў справу, але пасля выхаду на пенсію зноў стаў збіраць. Дакладна, колькі прадметаў у маёй калекцыі, не скажу, па прыблізных падліках, больш за 500. Ёсць рэчы з ЗША, Бельгіі, Ірландыі, Расіі, Літвы і іншых краін. Да ўсіх гэтых знаходак дадаўся медаль «За клопаты па першым усеагульным перапісе насельніцтва», — расказаў Анатоль Красіцкі.

Даведацца, каму ён належыць, хутчэй за ўсё, не ўдасца. Рарытэт застанецца ў сям'і Красіцкага. Акрамя таго, у яе зборы ёсць таксама значкі за ўдзел у перапісе насельніцтва СССР у 1989-м і Беларусі ў 2009 годзе (тады перапісчыкам быў сын Анатоля, Аляксандр).

Вышэй згаданым медалём узнагароджвалі тых, хто працаваў лічыльнікамі і арганізатарамі перапісу насельніцтва Расійскай імперыі. Узнагарода была заснавана па ўказе маладога тады імператара Мікалая II.

Перапіс канца XIX стагоддзя стаў першым і адзіным усеагульным перапісам насельніцтва Расійскай імперыі. Беларусы былі чацвёртымі па колькасці ў краіне пасля рускіх, украінцаў і палякаў. Тады на тэрыторыі Беларусі ў яе сучасных межах пражывала каля 6,6 млн чалавек.

Крымінал, здарэнні

Запрасіў у госці на сваю галаву

Новыя прыяцелі выкралі рэчы і больш за 10 000 долараў.

Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Маскоўскага РУУС Мінска ўстанавілі асобы маладых людзей, якія выкралі ў новага знаёмага буйную суму грошай.

Як паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама, вяртаючыся дадому, 57-гадовы мужчына сустрэў каля пад'езда двух маладых людзей, з якімі завязалася размова. У працэсе стасункаў сталы чалавек прапанаваў хлопцам падняцца да яго ў кватэру і працягнуць знаёмства за распіццём алкагольных напояў. Праз некаторы час мужчына заснуў, а маладыя людзі, скарыстаўшыся выпадкам, выкралі грошы, два наручныя гадзіннікі, розныя залатыя і сярэбраныя вырабы, пасля чаго з'ехалі ў Расійскую Федэрацыю. Агульная сума шкоды склала каля 20 000 долараў. Цікава, што злачынны заробак адзін з фігурантаў паспеў зафіксаваць на фота.

У ходзе правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў аператыўнікі ў Мінску затрымалі раней судзімага за хуліганства 18-гадовага мінчаніна і 19-гадовага хлопца, які не прыцягваўся да адказнасці. Хлопцы патлумачылі, што вярнуліся ў Беларусь, бо ў іх скончыліся грашовыя сродкі.

Праваахоўнымі органамі праводзіцца праверка з мэтай выяўлення датычнасці затрыманых да злачынстваў на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі і нашай краіны.

«Аддзячыў» абухом сякеры

Жыхару вёскі Азярніца Лунінецкага раёна зламалі нос на глебе асабістай непрыязнасці.

Мужчына сустрэў на вуліцы аднавяскоўца, які паскардзіўся на тое, што ў калодзеж звалiўся кот, папрасіў знаёмага дапамагчы дастаць жывёлу і пачысціць калодзеж. Калі просьба была выканана, гаспадар дома прапанаваў гэта адзначыць. Пасля некалькіх чарак паміж мужчынамі пачаўся канфлікт, які перайшоў у бойку, а ў выніку завяршыўся ўдарам сякеры па лбе ад гаспадара дома.

Пацярпелы страціў прытомнасць, а прыйшоў у сябе ўжо на суседскім участку, гаспадары якога выклікалі хуткую дапамогу. Медыкі паведамілі пра здарэнне ў міліцыю. Калі супрацоўнікі крымінальнага вышуку Лунінецкага РАУС прыехалі дадому да гаспадара студні, той паспеў пераадзецца, вымыць падлогу і сякеру. Аднак знішчыць усе сляды бойкі ў яго не атрымалася, паведамляе УУС Брэсцкага аблвыканкама. Заведзена крымінальная справа.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Сямейная газета

Выпуск № 15 (133)

ПРАЎДА ПРА ВОЖЫКАЎ

...Звыкла глядзім з дзецьмі ўвечары Viasat Nature — ад замалёвак з жывой прыроды і карысці больш, чым ад мультыкаў, і на лагодны «сонны» лад яны настройваюць няблага, прынамсі маіх малых. Раптам чую захоплены воклiч: «Ой, мама, глядзі, які міленькі!» Гляджу, хто там такі міленькі і харошанькі, — мамачкі мае, кракадзіл! Ні разу не Гена, а самы сапраўдны буйны алігатар, з падманліва-нежывымі жоўтымі вачыма і зубамі, параўноўваць памер якіх з чалавечымі нават не хочацца. Але гэта нам, дарослым, а дзяўчаткам — бач ты, міленькі.

Другая карцінка, ужо з натуры. Зладзілі сабе на выхадныя пазнавальную вылазку за горад, пяць у адным: і пагуляць па-за межамі горада, каляровым лісцем пашамацець, і накрычацца на тыдзень наперад, і свежым лясным паветрам падыхаць, і паздымаць прыгожых фота, і наведаць экатурыстычны комплекс недалёка ад сталіцы. Вось у апошнім, разглядаючы вялікі заапарк, сустрэліся мы са смелым, калі не сказаць нахабным, буслом — ходзіць за паўкрока ад людзей, дазваляе рабіць з сабой сэлфі, прымае дары ў выглядзе мясных кавалачкаў. «Мама, а можна я яму хлеба дам?» — просіць нейкі хлопчык і, атрымаўшы дазвол, доўга бегае следам за буслом, частуючы таго акрайцам. Птушка не ўзяла. «Значыць, не галодны», — зрабіла выснову маладая мама і вельмі здзівілася, калі работнік комплексу растлумачыў, што буслы, на хвілінку, не вераб'і і харчуюцца жывёльнымі кармамі, а не хлебам, пячэннем і чыпсамі.

Цяжка адказаць, колькі міфаў з дзяцінства захоўваецца і ў нашых галовах, — скажам, мая сяброўка і да трыццаці гадоў верыла, што вожыкі ядуць яблыкі. А ўсё чаму? Да мозгу касцей гарадская, да таго ж прыязджая з іншай краіны, яна не мела сваякоў на вёсцы і не бачыла блізка ні каровы, ні казы, ні гусей, качак, зайцоў, вожыкаў, не ведала, што ў Беларусі «ў дзікай прыродзе» жывуць чарапахі, і, як сама жартуе, дзесьці ў глыбіні душы лічыла, што куры нясуць адразу мытыя яйкі...

Гэта ўсё было б забаўна, каб не цягнулася з пакалення ў пакаленне. І ўжо нашы дзеці не баяцца ваўкоў, таму што ніколі іх не бачылі, жахаюцца, што ад каровы дрэнна пахне, а ў каня жоўтыя зубы. Таму, каб не пачуць аднойчы ад нашчадкаў, што булкі растуць на дрэвах, вывозьце іх на прыроду — хоць у абмежаваную прастору заапарка: нават калі вы самі яго не любіце, гэта першы і самы просты спосаб пазнаёміць дзіця з насельнікамі блізкіх і далёкіх лясоў, палёў і рэк. (Я ні ў якім выпадку не маю на ўвазе так званыя «кантактныя заапаркі», дзе жывёлы — разменны матэрыял на пацеху наведвальнікам і патэнцыйны рассаднік бактэрый, з-за чаго такія заапаркі ўжо забаронены ў многіх краінах свету — застаюцца толькі вялікія стацыянарныя ўстановы, дзе працуюць спецыялісты, якія могуць даходліва і праўдзіва расказаць пра паводзіны жывёл і як з імі абыходзіцца.) Выязджайце часцей у лес ці на возера — гэта выдатная магчымасць пабыць усім разам, праветрыць галаву ад гарадскіх праблем і тлуму, паказаць жыўцом: вось — вожык, а вось — вужык, гэта — касцяніцы, гэта — воўчае лыка, а там — мухамор, які можа быць зусім не падобны да малюнкаў у кніжцы, але ад таго не менш небяспечны. У маіх малых дагэтуль адно з самых яркіх уражанняў лета — «знаёмства» з вялізным сомам, якога злавілі незнаёмыя рыбакі на возеры. А бераг турэцкі ці які іншы — безумоўна, таксама добра, аднак толькі пасля таго, як у галовах малых адкладзецца, што кракадзіл не «міленькі».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Тыя, хто побач

Вераніка ПЛЯШКЕВІЧ:

«Захавальнік сямейнай казны — мой муж»

У сям'і вядомых акцёраў Веранікі Пляшкевіч і Андрэя Сенькіна бытавыя клопаты размеркаваны не зусім традыцыйна



На жаль, сустрэцца з сям'ёй у поўным складзе не ўдалося. Андрэй цяпер шчыльна заняты ў кінапраекце. Вераніка ж здолела знайсці час на размову. Калі ўжо парушана традыцыя дуэта ў інтэрв'ю, то і першае пытанне будзе не аб знаёмстве.

— У вас абодвух даволі багатая фільмаграфія, але не так часта здымаліся разам з Андрэем. Як успрымаеце тое, што вашы графікі рэдка супадаюць? Вось, можа, хацелася б куды-небудзь схадзіць з мужам, а ён на здымачнай пляцоўцы.

— Магу адказаць за дваіх. Мы вельмі рады, што нас запрашаюць здымацца ў кіно. Але ўсё ж галоўнае месца нашай работы — Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Горкага. Графікі складаюцца з улікам занятасці ў тэатры. А што датычыцца схадзіць з мужам... Вядома, мне падабаецца бываць з ім на цікавых для нас мерапрыемствах, на сяброўскіх вячорках.

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

Савет бацькаў

ТАТА МОЖА, ТАТА ВЕДАЕ І ТАТА ХОЧА...

Пра сацыяльнае безбацькоўства, фестываль татаў і стратэгію «О4»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Дарыце дзецям сваю прысутнасць. Яна значна важнейшая за любыя падарункі. Гэтае выслоўе ці не найбольш поўна раскрывае сэнс таго, як трэба выхоўваць сваіх дзяцей. Не толькі ўласным прыкладам і жыццёвым вопытам, а проста бавячы з імі час, ведаючы іх патрэбы, жаданні, настрой. Свядомыя бацькі, як цяпер кажуць, разумеюць гэта, а найбольш актыўныя стараюцца данесці да іншых. Як, напрыклад, члены арганізацыі «Савет бацькаў». Яе ўдзельнікі — таты, якія праз уласныя думкі, погляды, а недзе і памылкі прыйшлі да высновы, што бацька неабходны ў жыцці дзіцяці заўжды і ў розных іпастасях. Паразважаць над гэтым бацькі сабраліся за круглым сталом.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Сацыяльная кансультацыя

Калі беспрацоўны мае права на бальнічны ліст?

На пытанні нашых чытачоў адказваюць спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі.

На наступны дзень пасля звальнення ў сувязі са сканчэннем тэрміну працоўнага дагавора чалавек атрымаў траўму. Ці мае ён права на дапамогу па часовай непрацаздольнасці (бальнічны ліст)? Куды яму трэба звяртацца?

— Згодна з п. 2 Палажэння аб парадку забеспячэння дапамогамі па часовай непрацаздольнасці і па цяжарнасці і родах, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30.09.1997 № 1290, права на дапамогу па часовай непрацаздольнасці маюць грамадзяне, на якіх распаўсюджваецца дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне і за іх, а таксама імі самімі ў прадугледжаных заканадаўствам выпадках выплачваюцца абавязковыя страхавыя ўзносы на сацыяльнае страхаванне.

На непрацуючых асоб дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне не распаўсюджваецца, такім чынам, права на выплаты са сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання гэтыя асобы не маюць.

Выключэнне з гэтага правіла ўстаноўлена п. 8 Палажэння ў дачыненні да асоб, у якіх часовая непрацаздольнасць у сувязі з захворваннем або траўмай наступіла **на працягу 30 каляндарных дзён пасля спынення працоўнага дагавора па ўважлівых прычынах і доўжылася больш за 30 каляндарных дзён.** У гэтым выпадку дапамога па часовай непрацаздольнасці прызначаецца камісіяй па прызначэнні дапамог пры абласных і Мінскім гарадскім упраўленнях Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны і выплачваецца па ранейшым месцы работы.

Для разгляду пытання аб прызначэнні дапамогі ў парадку выключэння такому заяўніку неабходна звярнуцца ў раённы (гарадскі) аддзел Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва або ў абласное ці Мінскае гарадское ўпраўленні згаданага Фонду, дзе ён запоўніць заяву аб прызначэнні дапамогі, паведаміць (вусна або пісьмова) дату, час, месца і фактычныя абставіны атрымання траўмы, прадставіць дакумент аб часовай непрацаздольнасці і працоўную кніжку. Іншая неабходная для назначэння дапамогі інфармацыя будзе запатрабаваная ўжо самімі органамі Фонду.

* * *

Як аднавіць страхавое пасведчанне дзяржаўнага сацыяльнага страхавання?

— Парадак выдачы і замены страхавога пасведчання дзяржаўнага сацыяльнага страхавання ўстаноўлены «Правіламі індывідуальнага (персаніфікаванага) уліку ў сістэме дзяржаўнага сацыяльнага страхавання», зацверджанымі пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 8 ліпеня 1997 года № 837 (у рэдакцыі пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 31 жніўня 2009 года № 398).

Пасведчанне сацыяльнага страхавання падлягае аднаўленню пры страце, яго непрыдатнасці і ў іншых аналагічных выпадках. Для аднаўлення гэтага пасведчання працуючай застрахаванай асобе неабходна пісьмова звярнуцца да работадаўца. Работадавец запаўняе форму ПУ-1 «Анкета застрахаванай асобы» (тып формы — аднаўленне пасведчання сацыяльнага страхавання) і на працягу пяці рабочых дзён перадае яе ў орган Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва па месцы пастаноўкі на ўлік у якасці плацельшчыка абавязковых страхавых узносаў.

Калі застрахаваная асоба часова не працуе і не стаіць на ўліку ў якасці плацельшчыка абавязковых страхавых узносаў, то ёй неабходна самой прадставіць у орган Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва па месцы жыхарства форму ПУ-1 «Анкета застрахаванай асобы» (тып формы — аднаўленне пасведчання сацыяльнага страхавання) для атрымання новага пасведчання.

Пасведчанне сацыяльнага страхавання выдаецца органам Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва на працягу месяца з дня прыёму формы ПУ-1, яго выраб і выдача ажыццяўляюцца бясплатна.

Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.

Сітуацыя

ЗЛОЎЛЕНЫ — ЗЛОДЗЕЙ?

Чаго чакаць бацькам, калі іх дзіця злавілі на крадзяжы

«Маё дзіця дамоў прывяла міліцыя...» — голас знаёмай дрыжаў. Яна была напалохана, разгублена, ёй было соромна. Рэч у тым, што яе сын паспрабаваў вынесці з крамы цукеркі. Сям'я лічыцца матэрыяльна забяспечанай, і ўчынак хлопчыка быў нікому не зразумелы. Але, на думку начальніка інспекцыі па справах непаўналетніх УУС адміністрацыі Савецкага раёна Мінска Івана КАЦЭБЫ, такая сітуацыя не адзінкавая.

— Рэч у тым, што малыя не заўсёды ўсведамляюць прычыны сваіх дзеянняў, — кажа інспектар. — На крадзяжах пападаюцца дзеці з розных сем'яў. Таму кожнае такое здарэнне з іх удзелам мы разглядаем вельмі ўважліва і індывідуальна. І канешне, бацькам лепш ведаць, чаго чакаць пасля таго, як іх нашчадка затрымалі.

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Калі няма і чатырнаццаці...

Калі малое, што называецца, злавілі за руку, то супрацоўнікі крамы растлумачаць дзіцяці, што гэта крадзеж, і таму яны вымушаны разам з дзіцем пачакаць міліцыю і бацькоў. Дарэчы, ахова адразу павінна паведаміць супрацоўнікам міліцыі аб здарэнні з непаўналетнім. Потым работнік крамы можа прапанаваць малому прайсці ў службовае памяшканне, каб не перашкаджаць пакупнікам, а калі дзіця не згодна, то застацца з ім у гандлёвай зале. Інспектар па справах непаўналетніх выязджае на месца здарэння адразу і звязваецца з законнымі прадстаўнікамі дзіцяці, тлумачыць, дзе яны змогуць забраць малое. Звычайна гэта інспекцыя па справах непаўналетніх ці найбліжэйшае аддзяленне міліцыі.

Калі бацькі не могуць адразу прыехаць па малое, напрыклад, таму што знаходзяцца ў камандзіроўцы, то інспектар шукае іншых родных, якія змогуць забраць дзіця. Але яно абавязкова павінна ведаць дарослага, які прыедзе, — гэта могуць быць бабуля, дзядуля ці іншыя блізкія. Бывае, што родныя не могуць прыйсці за малым, і тады міліцыянер суправаджае дзіця дадому, бо яно знаходзіцца ў стане стрэсу і ў такіх выпадках яго нельга пакідаць і адпускаць аднаго.

— Да 14 гадоў адказнасць за дзіця нясуць бацькі, таму малое не будзе з'яўляцца суб'ектам правапарушэння, — тлумачыць Іван Кацэба. — Адказнасць за адміністрацыйныя правапарушэнні надыходзіць з 16 гадоў, але за некаторыя, у тым ліку і за крадзеж, — з 14. Малое да гэтага ўзросту разглядаецца больш як сведка здарэння. Адказвае ж у такой сітуацыі дарослы — але не за дробны крадзеж, а за ўхіленне ад выхавання дзіцяці. Мы вывучаем стан сям'і. І калі па месцы жыхарства яна характарызуецца станоўча, дзіця вучыцца нармальна, з боку педагогаў няма нараканняў, а такая правіна адзінкавая, то тут нама прычынна-выніковай сувязі паміж выхаваннем і ўчынкам малога. Тады пратакол на бацькоў увогуле не складаецца. Мы, канешне, працуем з такімі дзецьмі, размаўляем, паказваем адмысловыя відэаролікі, але ўсё гэта толькі з дазволу бацькоў.

Калі ўсё ж віна дарослых відавочная, то іх папярэджваюць ці штрафуюць на 10 базавых велічынь. Калі дзіця пападаецца яшчэ раз, то штраф можа дасягнуць 20 базавых велічынь.

Я коцікаў люблю...

З 14 гадоў падлетак нясе адказнасць за крадзеж і з'яўляецца суб'ектам правапарушэння. Пры паступленні паведамлення з гандлёвага пункта аб крадзяжы тавару чатырнаццацігадовым (і старэйшым) інспектар прыязджае на месца, прымае заяву ад кіраўніцтва крамы і забірае вінаватага ў аддзяленне разбірацца.

— Мы падлетка ўжо апытваем як асобу, у дачыненні да якой будзе весціся адміністрацыйны працэс, — кажа інспектар ІСН. — Але ўсё роўна адразу паведамляем пра здарэнне бацькам. Мы размаўляем з дзіцем у прысутнасці педагогаў, пры жаданні можам дачакацца і бацькоў. Але затрымліваць падлетка больш чым на тры гадзіны мы не можам. Хоць на самай справе гэта і не затрыманне — мы проста праводзім разбор заявы, якая да нас паступіла.

Для бацькоў наступстваў у такіх выпадках не будзе, але матэрыялы накіруюць у камісію па справах непаўналетніх. Гэта калегіяльны орган, дзе ўдзельнічаюць усе зацікаўленыя — прадстаўнікі адміністрацыі раёна, урачы, псіхолагі, педагогі, інспектар ІСН. Спецыялісты вырашаюць, як дапамагчы падлетку, каб выключыць у далейшым падобныя правапарушэнні. На працягу года з ім будзе праводзіцца індывідуальная прафілактычная работа. Калі, напрыклад, дзіця не занятае, то інспектары і педагогі шукаюць цікавы яму гурток. Яшчэ працягам гэтага года інспектар будзе наведваць падлетка ў школе і дома, а таксама весці работу з бацькамі. Інспектары стараюцца чым-небудзь зацікавіць дзіця, возяць на экскурсіі, у аквапаркі, гуляюць з падлеткамі ў футбол і падчас такіх нефармальных сустрэч проста размаўляюць.

— Ёсць розныя прычыны такіх правапарушэнняў сярод дзяцей, — расказвае Іван Кацэба. — Бывае, падлеткі крадуць, калі ідуць у заклад: маўляў, а я змагу. Ім і цукерка тая не патрэбна, абы паспрачацца. Бывае, канешне, трапляюць дзеці з сем'яў, у якіх дома проста не хапае элементарных рэчаў. Ну даўно не ела дзіця шакаладкі, не вытрымлівае і крадзе. Бываюць і іншыя абставіны... У нас на камісіі разглядалі дзяўчынку, якая крала кашачы корм. Ну што тут зробіш? Стаіць пятнаццацігадовае дзяўчо, плача горкімі слязамі, маўляў, катоў шкада. Рэч у тым, што яна падкормлівала іх пасля школы, дык яны яе ўжо чакалі пасля заняткаў. У той дзень у яе не было з сабой нічога. А жывёлы лашчацца і ідуць за ёй. Не вытрымала, зайшла ў краму і... папалася. Потым я яе на выстаўку катоў вадзіў падчас індывідуальнай прафілактычнай работы.

Невыпадковыя і выпадковыя

Калі дзіця паўторна пападаецца на крадзяжы ці любым іншым правапарушэнні ў перыяд індывідуальнай прафілактычнай работы, то пасля трэцяга разу яно ўжо атрымае афіцыйнае папярэджанне аб наступным (пасля чарговага парушэння) накіраванні ў спецыяльную ўстанову закрытага тыпу, а гэта можа быць школа ці ПТВ. Там «праблемныя» дзеці жывуць па рэжыме і сустракаюцца з бацькамі з пэўнай перыядычнасцю.

— Гэта не значыць, што ў такога падлетка будзе нейкае «кляймо», — кажа Іван Аляксандравіч. — Там дзеці атрымаюць атэстат і змогуць паступаць куды захочуць. Усё залежыць ад іх жадання. Дарэчы, малыя могуць трапіць у такую школу з 11 гадоў. А індывідуальная прафілактычная работа праводзіцца з імі ўжо з 10 гадоў.

Але міліцыя працуе не толькі з дзецьмі. Інспекцыя па справах непаўналетніх ладзіць спецыяльныя інструктажы для супрацоўнікаў гандлю, каб яны ведалі, як трэба сябе паводзіць у сітуацыі з крадзяжамі.

— Нядаўна разглядалі справу хлопчыка васьмі гадоў, які ў краме ўзяў цукерку і забыў яе ў кішэні, — патлумачыў інспектар. — На самай справе ён не думаў пра крадзеж, проста мама недагледзела, пакуль займалася пакупкамі. Сёння амаль усюды ёсць камеры, і самі ахоўнікі могуць убачыць, што перад імі не злодзеі. Але бацькі ў такіх выпадках таксама павінны ведаць, што яны абавязаны пакрыць прычыненую іх дзіцем шкоду. Дарэчы, калі цэласнасць упакоўкі не парушаная, то тавар можа вярнуцца на паліцы крамы для далейшай рэалізацыі. Калі ж бацькі адмаўляюцца плаціць, то адміністрацыя гандлёвага цэнтра можа прымусіць зрабіць гэта праз суд.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

vk.com

ТАТА МОЖА, ТАТА ВЕДАЕ І ТАТА ХОЧА...

Па формуле 1 + 1 = 11

Таварыства «Савет бацькаў» зарэгістравана гэтым летам і налічвае каля 25 чалавек. Дагэтуль яго актыўныя члены працавалі ў розных фарматах. **Старшыня праўлення грамадскай арганізацыі «Савет бацькаў» Аляксандр ВЯЛІЧКА** па сумяшчальніцтве яшчэ і дырэктар сацыяльна-асветніцкай установы «Бацькоўства». **Кірыл БУДКЕВІЧ, псіхолаг, член праўлення «Савета бацькаў»**, яшчэ і заснавальнік сямейнага цэнтра «Тата можа». Каб далучыцца да арганізацыі, трэба быць татам або хацець стаць ім, запэўніваюць удзельнікі савета.

Увогуле ў Беларусі не так шмат бацькоўскіх арганізацый. У большай ступені гэта ўсё адно праекты, абмежаваныя ў часе, лічаць удзельнікі арганізацыі. Таму і вырашылі аб'яднаць намаганні на агульнай платформе бацькоўства, выступаючы за сям'ю і дзяцей і не супраць кагосьці.

— У бацькі існуюць як мінімум чатыры галоўныя кампетэнцыі: забеспячэнне бяспекі, надзяленне ідэнтычнасцю, устанаўленне параметраў і крытэрыяў улады і ўмацаванне патэнцыялу. Таму ўцягнутасць бацькі ў жыццё дзіцяці вельмі важная для яго фізічнага росту і разумовага развіцця, — кажа Аляксандр Вялічка. — Пры гэтым яшчэ чатыры гады таму ў Беларусі індэкс уцягнутасці бацькі ў жыццё дзяцей складаў усяго чатыры працэнты. Гаворка ідзе пра актыўны час, які бацька праводзіць з малым. Гэтая сітуацыя стварае такое паняцце, як «сацыяльная безбацькоўшчына», калі тата дэюрэ ёсць, а дэ-факта — не. І ў нас яшчэ не самае горшае становішча, калі параўноўваць з іншымі краінамі. У той жа Малдове, напрыклад, індэкс каля 1,5 %, пры гэтым 60 % татаў і 40 % мам знаходзяцца за мяжой на заробках. У Рызе паказчык лепшы, чым у нас, можа, на 0,5 %.

Увогуле, чым далей на Усход, тым вышэйшы працэнт уцягнутасці бацькаў у выхаванне, аднак ён усё роўна не перавышае 15 %, як, напрыклад, у Казахстане. Прытым гэта не значыць, што па якасці ўцягнутасці гэты паказчык такі ж добры. «Там іншая парадыгма адносін: і насілле ў сям'і вышэйшае, і дзейнічае прынцып «б'е, значыць, любіць», — удакладняе старшыня.

Пераадолець бар'ер гэтых лічбаў, заахвоціць бацькаў да актыўных стасункаў з уласнымі дзецьмі і збіраецца ажыццявіць «Савет бацькаў».

— Мы распрацавалі стратэгію «О4». Гэта як цвёрдая формула кісларoду. Яна ўключае ў сябе «ответственное, осмысленное осознанное отцовство», — падкрэсліў Аляксандр Вялічка.

Як кажуць тут, аб'яднанне ў савет бацькаў працуе па формуле 1 + 1 = 11: намаганні далучаюцца адно да аднаго і множацца.

Калыханка, валейбол і шахматы

Свядомыя бацькі, удзельнікі арганізацыі ладзяць і плануюць мноства мерапрыемстваў. Яны праводзяць курсы бацькоўства, арганізуюць групы падтрымкі татаў, семінары, трэнінгі, круглыя сталы.

— Пасля яны падыходзяць і пытаюцца: а што далей? Многія проста пераасэнсоўваюць сваё стаўленне да сям'і і гатовы несці далей гэтыя памкненні, арганізоўваючы нешта сваё на базе школ, напрыклад.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Актыўныя, адказныя, апантаныя — такія таты нам патрэбны!

Быць бацькам не цяжка, упэўнены таты. Тры абдымкі ў дзень даюць малому зразумець, што сусвет ставіцца да яго прыхільна.

І ў нашага савета як арганізацыі цяпер больш шанцаў дапамагчы гэтым ініцыятывам развівацца, — кажа Аляксандр Вялічка. — У Лошыцы ёсць, напрыклад, закінуты сад, некалькі бацькаў хочуць гэтае месца акультурыць, і мы з радасцю дапаможам. Мы за любую ініцыятыву, скіраваную на сям'ю.

Сумесна з упраўленнем па ахове здароўя Мінгарвыканкама ў жаночых кансультацыях распачалі семінары для татаў і мам. «Як нарадзіць генія» — гэта курсы па выхаванні яшчэ да з'яўлення дзіцяці на свет, падчас якіх, напрыклад, на сустрэчы запрашаюць педагога па вакале, каб вучыць бацькоў калыханкам.

Забаўляльная праграма з конкурсаў ды канцэртаў сёлета, як мяркуецца, увасобіцца ў «Фестываль бацькоўства», які ўжо ўключылі ў план гарадскіх мерапрыемстваў да Дня таты, што святкуецца ў трэцюю нядзелю чэрвеня. Мерапрыемства, думаюць бацькі, працягнецца два дні — 20 і 21 чэрвеня — і будзе насычана музыкай, спортам і грамадскімі ініцыятывамі.

Пра спорт, дарэчы, тут не забываюцца — арганізуюць валейбольныя турніры. Летась у іх ўдзельнічалі 38 камандаў, з якіх больш за палову падлеткавыя. Замахваюцца і на шахматны біятлон, і на велапрагулкі.

— Спорт — адна з тых сфер, дзе мужчына-бацька можа стаць настаўнікам. Тая сфера, куды ён можа ўцягнуць дзяцей. Гэта вельмі збліжае, — ведае **Аляксандр ПРУДНІКАЎ, лінгвіст, член праўлення «Савета бацькаў».** — Два гады ўжо адбываюцца валейбольныя турніры для падлеткавых дваровых камандаў. У іх бяруць удзел і каманды бацькаў. Сёлета вырашылі распачаць таксама футбольны турнір у фармаце «восем на восем». Жараб'ёўка адбудзецца ў снежні, а з канца сакавіка пачнём гульні. Разлічваем на 32 каманды, ужо ёсць ахвотныя з Віцебскай і Гомельскай абласцей.

Мужчына з вялікай літары «М»

Каб грамадства было здаровае, трэба свае амбіцыі адсоўваць убок. Пакуль дарослыя высвятляюць, ці добра яны ўплываюць на дзяцей і як гэта лепш рабіць, малыя проста вырастаюць з дапамогай сродкаў камунікацыі, лічыць **Анатоль ШЫРВЕЛЬ, блогер, член праўлення «Савета бацькаў»:**

— Калі дзіцячае выхаванне пусціць на самацёк, вырастае нешта, з чаго мы потым здзіўляемся: адкуль яно ўзялося? А праблема ў тым, што мы ў свой час ніяк не адрэагавалі. Выхаванне — гэта працэс, які адбудзецца з намі ці без нас. І мы выбіраем першы варыянт.

Сучасныя бацькі апынуліся на задворках выхавання ўласных дзяцей. Яны або самі трапілі туды, або іх устаранілі ад выхавання матулі. А на долю бацькі застаецца роля здабытчыка грошай, мяркуе Кірыл Будкевіч:

— Уласным вопытам мы паказваем, што гэта не так. Што ўцягнуты ў стасункі з дзецьмі тата — гэта здорава, гэта эмацыянальная падтрымка і для яго, і для дзіцяці, і для мамы. Гэта залог сямейнага дабрабыту, бо калі бацька ўдзяляў час сям'і, тут ёсць і шчасце, і любоў, і здароўе — усё, што трэба для гарманічнага развіцця сям'і. Бацькоўства дапамагае максімальна раскрыцца мужчыну з вялікай літары «М» і стаць цэльнай асобай. Мы працуем над тым, каб такіх станавілася ўсё больш.

Быць бацькам не цяжка, упэўнены таты. Тры абдымкі ў дзень даюць малому зразумець, што сусвет ставіцца да яго прыхільна. Калі тата хоць паўгадзіны ў дзень праводзіць з дзіцем, гэта ўжо добра.

— На кожным этапе ўплыў бацькі на дзіця прыводзіць да пэўных наступстваў, ён увесь час патрэбны, — упэўнены Анатоль Шырвель, які ў свой час 28 сутак у месяц мог правесці ў камандзіроўках і практычна не бачыў, як раслі яго першыя дзеці. А іх у блогера шэсць, і цяпер ён ведае цану бацькоўскаму шчасцю.

Бацька можа знаходзіць час, каб удзяляць увагу дзіцяці, упэўнены і **Аляксандр ПАТЛІС, спявак,** які нядаўна з жонкай падлічыў, што на світанку бацькоўства яго не было дома гадоў пяць-шэсць.

— Я быў тады ў складзе групы «Новы Іерусалім», і мы шмат ездзілі на гастролі, камандзіроўкі цягнуліся па некалькі месяцаў. 180 дзён у год мяне не было дома, — успамінае спявак. — Калі з'явіўся Ляон, я вырашыў, што гастрольны графік не будзе цягнуцца больш за паўтара-два тыдні. Сыну неабходна больш увагі.

Аляксандр Патліс стараецца ў тым ліку браць хлопчыка, якому нядаўна споўнілася сем, з сабой:

— Каб ён прывыкаў да майго свету, уваходзіў у кола маіх сяброў, у мужчынскі свет. На падсвядомасці, упэўнены, гэта будзе ў яго адкладацца. А яшчэ мой сын чакае пятніцы, калі спіць у адным пакоі са мной, і гэта азначае, што можна да ночы глядзець мульцікі.

Пазваніце майму тату!

Закранулі і праблему стаўлення грамадства да шматдзетных сем'яў. У прыватнасці, аказанне падтрымкі, якая, на думку Анатоля Шырвеля, павінна быць адраснай і адпавядаць канкрэтным патрэбам і сітуацыі ў сям'і. Нельга кіравацца выключна прынцыпам «у цябе трое, значыць, неабходна дапамога».

— Тое, што сапраўды трэба шматдзетным, — больш здаровая рэакцыя грамадства. Вялікія сем'і не прэтэндуюць на чыесьці матэрыяльныя даброты, большасць самі ў стане справіцца з выхаваннем і ўтрыманнем сваіх дзяцей, — запэўнівае ён. — Самая добрая дзяржаўная падтрымка ў гэтым плане — працаваць над тым, каб таты і мамы маглі нармальна зарабляць. Здаровая эканоміка — самая класная падтрымка шматдзетных.

«Сучасныя бацькі апынуліся на задворках выхавання ўласных дзяцей. Яны або самі трапілі туды, або іх устаранілі ад выхавання матулі. А на долю бацькі застаецца роля здабытчыка грошай».

Савет бацькаў звярнуў увагу і на тое, што неабходна ўсім пазбаўляцца ад стэрэатыпу: маўляў, шматдзетная сям'я — гэта адразу дрэннае становішча і нястача. А яшчэ згадалі асабістае.

Заснавальнік і дырэктар школы польскай мовы Аляксандр ПРУДНІКАЎ страціў бацьку, калі хлопцу споўнілася 15, але і да гэтага адносіны паміж імі былі не самыя лепшыя:

— Я не меў прыкладу добрага бацькоўства. І цяпер, калі на нешта негатыўна рэагую, разумею, што паводжу сябе, як мой тата. Бацька павінен стварaць у сям'і атмасферу бяспекі і ўпэўненасці. У сябе ў школе я адразу бачу па вучнях, хто з няпоўнай сям'і, бо адсутнасць бацькі адбіваецца на дзецях. Раней я прападаў на рабоце з 8 раніцы да 10 вечара, аднак калі мы з жонкай даведаліся, што ў нас будзе сын, зразумеў, што не буду бачыць яго пры такім рэжыме. І прыблізна з год таму перайшоў на іншы графік — працую толькі да 7 вечара. Сын заўжды прыходзіць абдымацца, калі я вяртаюся дадому. А калі затрымліваюся ў школе, жонка дасылае відэа, як малы падыходзіць да дзвярэй і грукае па іх, нібыта пытаючыся, дзе тата.

Напэўна, аднойчы настае час, калі табе самому становіцца прыкра, што цябе мала са сваімі дзецьмі, і ты пачынаеш мяняць сваё жыццё пад іх, разважае Анатоль Шырвель:

— Думаю, галоўны крытэрый паспяховасці цябе як бацькі — гэта калі дзеці нешта ўчынілі, але іх не пужае, што пра гэта даведаюцца мама і тата, якім паведамяць, выклічуць у школу. Калі дзіця, трапіўшы ў складаную сітуацыю, само скажа: пазваніце майму тату, ён дапаможа, — гэта і ёсць поўны давер і паразуменне.

Кранальныя гісторыі, простыя ўчынкі, шчырыя словы. І, здаецца, шчырае жаданне гэтых мужчын змяніць стаўленне да татаў і іх саміх, абапіраючыся на ўласныя памылкі. Расказаць мужчынам, як проста быць татам.

Галоўнае, каб гэта здарылася тады, калі дзіця яшчэ мае ў табе патрэбу.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Анатомія пачуццяў

ДВОЕ — ГЭТА ЗАНАДТА?

Няведанне сябе, крызісы і «кульгавы» інтым... Што яшчэ прыводзіць да разводаў

Статыстыка — рэч не толькі ўпартая, але часам і бязлітасная. Згодна з ёй, кожная другая сям'я ў Беларусі распадаецца, а летась колькасць разводаў павялічылася ажно на 10 працэнтаў. У цэлым па краіне на 60 714 шлюбаў прыпала 33 152 разводы. У 2018 годзе ў краіне на 1000 шлюбаў зарэгістравана 546 разводаў, а ў 2017-м з 1000 шлюбаў распалася 483. Як так здараецца, што вялікая колькасць мужчын і жанчын гатовы разбурыць свае сем'і? Адказ на гэтае пытанне наш карэспандэнт шукала ў Мінскім гарадскім цэнтры сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей з дапамогай псіхолага Наталлі САСУНКЕВІЧ, якая працуе з сужэнцамі ў крызісным стане.

— Галоўнай прычынай разводаў многіх партнёраў можна лічыць іх розныя сістэмы каштоўнасцяў, рознае светаадчуванне і светапогляд. Маладыя людзі пачынаюць сустракацца, не звяртаючы ўвагі на гэтыя моманты. У іх усё на эмоцыях! Яны кахаюць адно аднаго і хочуць быць разам. На самай справе шлюб — гэта вялікая праца і адказнасць. Уменне жыць у пары — майстэрства, якому трэба вучыцца з самага дзяцінства.

— Як гэтаму навучыцца і дзе?

— Кожны чалавек мае навык узаемадзеяння з іншымі людзьмі. Калі жанчына ўмее размаўляць з мужчынам, а мужчына з жанчынай, і пры гэтым кожны прыслухваецца і да сябе, і да іншага, то такія пары змогуць пазбегнуць разводу. У такіх выпадках партнёры бачаць сістэму каштоўнасцяў адно аднаго і, калі адчуваюць, што яны, напрыклад, розныя, то яшчэ да шлюбу будуць думаць, што з гэтым рабіць.

Любы чалавек вучыцца адносінам у сваёй сям'і. Дзеці з маленства бачаць, напрыклад, што дома прынята гаварыць пра свае патрэбы і з разуменнем ставіцца да патрэб іншых дамачадцаў, усведамляюць, што ў адной сям'і сабраны людзі з рознымі густамі і жаданнямі, але пачуццё любові і павагі пры гэтым не губляецца.

— Вы цяпер кажаце пра мадэль сям'і здаровай. Але калі б сем'і былі такімі ў мінулым пакаленні, мы б не бачылі такой статыстыкі сёння...

— На жаль, так склалася, што дзяцей часцей за ўсё выхоўвае адна маці. Таму, канешне, малым цяжка навучыцца здаровым зносінам паміж мужчынам і жанчынай. Але сёння на дапамогу прыходзяць псіхолагі, якія могуць навучыць чалавека прыслухоўвацца да сваіх патрэб і чуць іншых.

— Ну вось маладыя людзі ўсё абдумалі, светапогляды параўналі... Здаецца, усё добра. Пабраліся шлюбам, і цяпер ім не пагражае развод?

— Не, ёсць і іншыя прычыны расстання — крызісы. Няўменне перажываць гэтыя выпрабаванні, адсутнасць унутраных рэсурсаў і інфармацыі прыводзяць да распаду сям'і. Першы год у шлюбе — крызіс, нараджэнне дзіцяці, не важна якога: першага, другога, трэцяга — крызіс, жанчына выйшла на работу з дэкрэтнага водпуску — крызіс, малы пайшоў у школу — крызіс... Увогуле іх мноства. Галоўнае, не пасаваць перад імі, адаптавацца і дапамагаць адно аднаму. Вельмі важная і падтрымка родных — бацькоў, бабуль і дзядуляў.

Беларусы не спяшаюцца рана ствараць сем'і. У сярэднім мужчыны жэняцца ў 28,1 года, жанчыны выходзяць замуж у 26.

— Што можа аб'яднаць людзей падчас крызісу?

— Калі ў пары ёсць інтымныя зносіны, якія задавальняюць дваіх, то шанцаў зберагчы шлюб становіцца больш. Бывае, прыходзяць людзі да мяне з праблемай ва ўзаемаадносінах. Пачынаем гаварыць, высвятляць, і аказваецца, што партнёр сексуальна незадаволены. Пра гэта нельга саромецца гаварыць. Калі секс у шлюбе «кульгае», хутчэй за ўсё пару чакае развод. Ёсць людзі са слабай палавой канстытуцыяй, якім рэгулярны секс не патрэбны, а іншым, наадварот, вельмі важна, каб гэта было стабільна і часта. Шлюбы паміж першымі і другімі амаль безнадзейныя.

— А ці варта заўсёды захоўваць шлюб? Напэўна, ёсць такія абставіны, калі лепш разысціся. Напрыклад, алкагалізм партнёра ці сямейны гвалт...

— Не ўсё так проста. У алкаголіка ёсць сузалежны. Калі жанчына была сузалежнай, а потым нешта здарылася ў яе жыцці і ў яе раптам змяніўся светапогляд, — яна можа сысці з такіх адносін. Тое самае ў пары агрэсар — ахвяра. Калі ахвяра больш не захоча ёю быць, пачне працаваць над сабой, ратаваць сябе — пара таксама распадзецца. Але ўсё гэта адбудзецца толькі праз пошук і знаходжанне шляху чалавека да сябе.

Бывае, да мяне прыходзяць людзі, якія пражылі ў шлюбе па дваццаць гадоў. Раней іх усё задавальняла, а дзеці выраслі, і сужэнцы сталі нібыта чужыя. Сядзяць такія на кансультацыі і раптам раскрываюцца адно перад адным — і тады ўжо немагчыма прадугледзець, як будуць развівацца падзеі.

Была ў мяне пара, дзе муж трошкі раней зразумеў, што яны з жонкай вельмі розныя. Адкрыўся на прыёме і... сышоў. Пара распалася. А было наадварот: на прыёме людзі здзіўляліся глыбіні адно аднаго, рабіліся бліжэйшыя, і шлюб станавіўся больш пяшчотным і цікавым.

Гарадскія жыхары разводзяцца часцей, чым вяскоўцы: на 1000 шлюбаў у горадзе прыпадае 570 разводаў, у сельскай мясцовасці гэтая лічба склала 416.

Часцей за ўсё нам удаецца наладзіць адносіны паміж сужэнцамі, мы дапамагаем ім пераадолець сямейныя выпрабаванні і крызісы. Ну а самая галоўная парада маладым: перш чым пабрацца шлюбам, неабходна спачатку спазнаць сябе, свае патрэбы. І калі раптам у жыцці з'явіцца чалавек, якога адчуеце, пачуеце і зразумееце, тады — у добры шлях.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

ВОБЛАСЦЬ АБО ГОРАД	Колькасць шлюбаў у 2018 годзе	Колькасць разводаў у 2018 годзе
Гродзенская	6 469	3 484
Магілёўская	6 814	3 827
Віцебская	7 025	4 182
Брэсцкая	8 337	4 193
Гомельская	8 763	4 878
Мінская	8 881	5 041
Мінск	14 425	7 547

З нашай пошты

...А МАЦІ ЧАКАЛА

БЫЛА субота. Ужо з самай раніцы Марыя Сцяпанаўна чакала сына Сяргея. Ён працаваў у райцэнтры на прадпрыемстве электрыкам і ўчора па мабільным сказаў, што на выхадныя прыедзе дадому.

Маці ўзрадавалася, бо не бачыла сына ўжо тры тыдні. Адразу ж пасля гутаркі пайшла прыбіраць хату. Не таму, што даўно не прыбірала, проста яна рабіла так заўсёды, калі сын казаў ёй, што збіраецца прыехаць. Хацела, каб хата выглядала па-святочнаму прывабнай.

З самай раніцы ў суботу жанчына растапіла печ. У каморы назбірала вялікай бульбы. Абабрала, надрала яе на дробнай тарцы. Дадала дзёртай цыбулі і солі. Пачала пячы дранікі.

Калі прыедзе Сяргей, Марыя Сцяпанаўна на газнічцы хутка пасмажыць яешню са скваркамі. Вось будзе яму і абед.

Толькі сын не з'яўляўся. Хоць аўтобус з райцэнтра ўжо стаяў на прыпынку. Яго можна было бачыць з акна іх дома.

Жанчына выйшла на двор, крыху пахадзіла па ім. За ёй увязалася некалькі курэй, якія думалі, што гаспадыня вынесла ім ласунак. Каля будкі завіляў хвастом Шарык. Ён, пэўна, як і куры, таксама лічыў, што яго хочуць пачаставаць, хоць гадзіну таму ўжо атрымаў свой сняданак.

Зразумеўшы, што сын гэтым рэйсам не прыехаў, маці вярнулася ў хату. Пэўна, спазніўся, падумала. Нічога, прыедзе пазней. Аўтобус з райцэнтра наведваўся ў іх вёску тройчы на дзень.

Хоць, канешне, было сумна. Выхадныя праляцяць хутка. Ды і дабрацца назад у горад трэба. Дома сын пабудзе не так шмат, а потым зноў прыедзе праз які месяц.

Яна прылегла на ложак. Не заўважыла, як задрамала.

МАРЫЯ Сцяпанаўна ўжо пяць гадоў была на пенсіі. Жыла адна. Муж Толя памёр два гады таму. Ён так і не дачакаўся пенсіі, пра якую марыў апошнія пяць гадоў. Марыў таму, што сілы не ставала, а на работу трэба было ісці штодня. У калгасе яе, работы, хапала. Нават у выхадныя.

А яна — жонка — дачакалася. Хоць усё жыццё працавала таксама даяркай у тым жа калгасе. Старшыня прасіў яе, каб засталася. Маўляў, няма каму замяніць. Але Марыя не пагадзілася. Усё ж нялёгкая гэтая праца. Падымайся вельмі рана, каб трапіць на ранішнюю дойку. Потым удзень ідзі, увечары ідзі.

З мужам яны пражылі разам трыццаць гадоў. Сяргей быў адзіны іх сын. У дзяцінстве песцілі яго як маглі. Нямала ж зараблялі па вясковых мерках! І адзенне набывалі самае лепшае, і ў краме грошай на ласункі не шкадавалі. Сала з мясам было сваё.

Ды толькі не пайшло гэта на карысць ні ім, ні сыну. Непаслухмяны вырас. У школе настаўнікаў не слухаўся, з аднакласнікамі лез біцца. Неаднаразова іх, бацькоў, выклікала да сябе дырэктар школы. Скардзілася, прасіла паўплываць на сына. А то і гразілася, што ў дзясяты клас Сяргея не возьмуць.

Ды толькі нічога не дапамагала. Хлопцу той дзясяты клас і не патрэбен быў.

«У ПТВ пайду, здалася мне ваша школа», — адказваў ён настаўнікам і бацькам.

І пайшоў. Выбраў прафесію электрыка.

Бацькі нават радаваліся. Сапраўды, прафесія патрэбная і не такая цяжкая. Гэта ж не ў каропніку і не ў трактары кожны дзень...

У прафесійна-тэхнічным вучылішчы Сяргей пачаў піць і курыць. Але так-сяк усё ж адвучыўся і спецыяльнасць атрымаў. Пайшоў працаваць на завод. Жыў у пакоі інтэрната ад таго ж самага прадпрыемства. Хутка ажаніўся. Алена была яго равесніца, працавала ў цырульні.

Пражылі нядоўга. Праз год разышліся. Як кажуць, не сышліся характарамі. Ды і як маглі? На спатканнях Алена прывыкла бачыць Сяргея вясёлым і клапатлівым. Пасля вяселля ж усё змянілася. Ён прыходзіў з работы нападпітку, часам лез з кулакамі. Дзякуй, дзяцей не нарадзілі. Хто б іх расціў?

Цяпер сын жыве ў аднапакаёвай кватэры. Вядома, першы ўзнос зрабілі яна з мужам. А крэдыт штомесяц плаціць ужо Сяргей. Канешне, маці крыху дапамагае грашыма. Але ўжо не так, як тады, калі быў жывы муж.

ЖАНЧЫНА прачнулася. Была гадзіна дня. Праз паўгадзіны ў вёску зноў прыедзе чарговы аўтобус з райцэнтра. «Можа, на гэтым з'явіцца?» — падумала. Падняласа з ложка, села на табурэт, што стаяў каля акна, стала глядзець убок прыпынку. Неўзабаве пад'ехаў аўтобус. Марыя Сцяпанаўна бачыла, як з яго выходзілі людзі. Сына не заўважыла. Не з'явіўся ён і дома. Маці зразумела: не прыехаў і гэтым рэйсам.

Вырашыла патэлефанаваць сыну на мабільны. Свой тэлефон (вельмі просценькі) у яе таксама быў. Выклік абанента ішоў, але ніхто не адказваў. Закралася трывога. Да таго, што сын не заўсёды падымаў мабільны, жанчына прызвычаілася. Вядома — работа. Але сёння ён быў выхадны, і гэта насцярожвала.

Каб адагнаць дурныя думкі, Марыя Сцяпанаўна вырашыла пакарміць сабаку і курэй. Шарык радасна завіляў хвастом, калі гаспадыня наклала яму варанай бульбы з сальнымі скуркамі. А куры кінуліся дзяўбці прыгатаваную для іх пшаніцу.

Праз гадзіну яна патэлефанавала сыну зноў. Гэтым разам яго тэлефон быў адключаны.

«Што ж там здарылася? — думала жанчына. — Забыўся на абяцанне? З'явіліся іншыя планы?»

Сяргей не прыехаў і вечарам. Калі куры паселі на седала, жанчына адпусціла з ланцуга сабаку. Вярнулася ў хату, прылегла на ложак.

...Маці не ведала, што на аўтавакзале сын выпіў і ўчыніў бойку з такім жа, як сам, п'яным мужыком. Што абаіх завезлі ў міліцыю, а потым адправілі ў выцвярэзнік. Што не з'явіцца ён і заўтра, бо не паспее.

І ёй трэба будзе зноў чакаць, думаць, каб не здарылася што-небудзь.

І спадзявацца, што сын нарэшце прыедзе.

Андрэй СІДАРЭЙКА.

«Захавальнік сямейнай казны — мой муж»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Вераніка, для артыста важна пабыць сам-насам з сабой?

— Думаю, гэта важна для ўсіх у пэўных дозах. Часам трэба паслухаць цішыню, паслухаць сябе, адпачыць ад людзей, нават ад самых блізкіх. Калі вельмі стамляюся на здымачнай пляцоўцы, прыходжу дадому і мне неабходна хоць бы паўгадзіны пабыць адной. Калі Андрэй дома, ён ведае, што так я перазагружаюся. Напрыклад, іду на кухню, мыю посуд. Праз паўгадзіны, як я жартую, вяртаюся ў сям'ю.

— Раскажыце, дзе вы пазнаёміліся з Андрэем?

— Тут, у тэатры. Але спачатку знаёмства было завочным, і тое я толькі чула пра Андрэя. У тэатральным асяроддзі прайшоў слых, што ў ТЮГ — Тэатр юнага гледача — прыехаў з Пінска вельмі цікавы хлопец, які спявае. Потым ён прыйшоў у наш тэатр на пробы. Галоўным рэжысёрам у той час быў Барыс Луцэнка, і ён вырашыў прыняць Андрэя ў трупу. Наш найстарэйшы акцёр, член мастацкага савета тэатра Расціслаў Іванавіч Янкоўскі, таксама ўхваліў кандыдатуру Андрэя. А нам, маладым актрысам, неяк сказаў: «Такі абаяльны хлопчык да нас прыходзіць, блакітнавокі. А як спявае...» Увогуле, мы ўсё пра яго чулі, але не бачылі. Аднойчы я даведалася, што Андрэй у тэатры, і вырашыла на яго паглядзець: звесілася з лесвіцы і... убачыла толькі макушку. Асабістае ж знаёмства нейк хутка перарасло ва ўзаемную цікавасць.

— Перыяд заляцанняў колькі доўжыўся?

— Прыкладна паўгода. Мы хутка зразумелі, што нам хочацца быць разам.

— Цікава, як праходзяць акцёрскія вяселлі?

— Яго ў нас не было. Мы не любім усялякую пампезнасць, не бачылі неабходнасці і ў яго арганізацыі. Мы бывалі на вяселлях у сяброў і разумелі, што для жаніха і нявесты гэты дзень зусім не святочны, а неверагодна клопатны. А нам гэтага не хацелася. Проста зарэгістравалі шлюб у загсе ў звычайным адзенні ў дзевяць раніцы.

— Ствараючы сям'ю, дамаўляліся, хто за што адказвае, ці ўсе правілы фарміраваліся па ходзе п'есы?

— Ніякіх дамоўленасцяў, хто мые посуд, хто выносіць смецце, не было. Адзінае, у чым прыйшлі да згоды: захавальнік сямейнай казны — Андрэй. У мяне грошы выцякаюць скрозь пальцы, як вада. Прычым я выдаткоўваю іх не столькі на нейкія дзявочыя радасці, колькі на падарункі, забавы для кампаніі. А муж умее рацыянальна кіраваць фінансамі, і мяне гэта абсалютна задавальняе.

Я люблю і ўмею гатаваць. Таму хаджу ў краму па прадукты. Андрэй у нас адказвае за вопратку: сочыць, што трэба аднесці ў хімчыстку, у рамонт, пральная машына — таксама яго цацка. Усе астатнія бытавыя справы робяцца па прынцыпе: у каго ёсць час і ахвота, той і робіць. Часам мы ўсё робім разам, напрыклад, ідзем у краму. Але ў нас ёсць і свая прастора, дзе мы можам пабыць адны. Я, напрыклад, люблю ўзяць кнігу і пачытаць, а Андрэй — паглядзець фільм.



Вераніка ПЛЯШКЕВІЧ у мюзікле «Дзінь-дон, я ваша мама».

Ён вельмі любіць гатаваць мяса, робіць гэта выдатна. Я ж люблю выпякаць. Мы ўвогуле вельмі падобныя ў нашых густах і звычках. Нам добра разам, і мы не ўяўляем, як можам жыць паасобку.

— Вы раўнівая? Перажываеце, калі Андрэй на экране цалуецца з іншай актрысай? А яшчэ ж і паклонніцы ёсць...

— А што перажываць? Гэта наша работа. Я ведаю, што часам у артыстаў здараюцца раманы на здымачнай пляцоўцы. І так — нікуды не дзецца ад гэтага ў глыбіні душы прыхаванага: «Маё». Што датычыцца паклонніц, то яны не блытаюць цікавасць да акцёра з цікавасцю да жанатага мужчыны.

— Як Андрэй рэагуе на вашых паклоннікаў, прыкладна ведаеце?

— Мяркуючы па яго рэакцыі, задаволены, калі пасля спектакля мне дораць кветкі — значыць, усё прайшло паспяхова.

— Вераніка, трэці год вы выступаеце ў ролі тэленяні Палінкі. А свае дзеці ёсць?

— Дзяцей у нас пакуль няма, але ўсяму свой час. Дзяцей я вельмі люблю. Мой удзел у «Калыханцы» на тэлеканале «Беларусь 3» дае неверагодны пазітыўны вопыт зносін з дзецьмі нават па той бок экрана. Гэта каласальная адказнасць, бо маленькія гледачы вераць кожнаму нашаму слову. Няняй Палінкай працую з задавальненнем!

«Аднойчы я даведалася, што Андрэй у тэатры, і вырашыла на яго паглядзець: звесілася з лесвіцы і... убачыла толькі макушку».

А цяпер разам з акцёрамі нашага тэатра Вольгай Здзярскай, Сяргеем Чэкерэсам і калегамі з іншых тэатраў рыхтуем навагодні сямейны спектакль «Дзінь-дон, я ваша мама!» Гэта класічны добры мюзікл з выдатнымі вершамі Юрыя Энціна. Думаю, што ён спадабаецца дзеткам, а іх бацькі ўспомняць аднайменны фільм.

— Як вам здаецца, без чаго нельга абысціся ў сямейным жыцці?

— Думаю, без даверу, узаемнай цікавасці і павагі, агульных мэт сям'я не адбудзецца. Але хоць я замужам дзесяць гадоў, не магу лічыць сябе экспертам. На самай справе, ніколі няма гарантый, што шлюб не распадзецца праз 20 ці нават 40 гадоў, але я спадзяюся, што гэта не пра нас.

Аксана ЯНОЎСКАЯ.
Фота з асабістага архіва Веранікі Пляшкевіч.

Вераніка ПЛЯШКЕВІЧ — вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага, уладальнік медаля Францыска Скарыны. Занятая амаль у дваццаці спектаклях тэатра. Вераніка актыўна здымаецца ў кіно, сярод карцін з яе ўдзелам: «Шчыт Айчыны», «Пацалунак Сакрата», «Знахарка», «Самотны вострaў», «Смерць шпіёнам. Лісіная нара», «Ой, ма-мач-кі!», «Яна не магла інакш», «Сляды апосталаў», «Усе скарбы свету», «Не пакідай мяне», «Любімы горад», «Прасцей простага», «Вярніся ў Сарэнта», «Усё магло быць інакш», «Маруся» і многія іншыя.

Андрэй СЕНЬКІН — У Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага працуе з 2008 года. Заняты ў бягучым рэпертуары тэатра. Запатрабаваны кінаакцёр. Сярод фільмаў з яго удзелам папулярныя кінакарціны: «Жыццё ў пазыку», «Жураў», «Брэсцкая крэпасць», «Паляванне на гаўляйтара», «Талаш», «Знахарка», «Смяротны танец», «Снайпер-2. Тунгус», «З любімымі не растаюцца», «Не пакідай мяне», «Разарваныя ніткі», «Сляпы разлік», «Сыходзячая натура», «Чорная павуціна», «Па лепшае жыццё», «Падсадная качка», «Колер саспелай вішні» і шэраг іншых.

Фота БелТА.

Вераніка ПЛЯШКЕВІЧ у ролі Паўліны Мядзёлкі на здымках фільма пра лёс народнага паэта Беларусі «Купала».

Мамін дзённік

ЧЫІХ ГЕНАЎ БОЛЬШ?

«Каб і не ведаў, хто бацька, адразу сказаў бы, чыё дзіця», — ужо не ўпершыню кажа нехта са знаёмых, калі сустракае нас з Арцёмкам на вуліцы. Без цяжкасцяў «устанаўліваюць» бацькоўства і калі з унукам бавіць час бабуля Аліна, абодва сыны якой кропля ў кроплю падобныя адзін на аднаго. «Выліты татка», — надакучыла чуць і ад сяброўак, чарговы раз дасылаючы ім новы фотаздымак малога.

Да таго, што Цёмік — татаў сын, я ўжо прызвычаілася. Яшчэ ў радзільні стала ясна: малы пайшоў не ў маці. Мала што доўгенькі, як казалі ўрачы («відаць, бацька высокі?»), дык яшчэ і крыклівы (адхінуцца паснедаць ці на якую працэдуру было выпрабаванням). Сваякі, што прыходзілі ў адведкі, таксама падабенства з Канютамі не знаходзілі.

Хоць асабіста я, шчыра кажучы, маленькай бацькавай копіі ў Арцёмку асабліва не бачыла. Пакуль не дабралася да свякроўчынага фотаархіва і не знайшла старэнькі, крыху размыты ад часу фотаздымак, на якім было незразумела, ці то муж на ім, ці то Цёма. З фотакарткі на мяне глядзеў мой маленькі сынок, толькі якасць ілюстрацыі, ды і здаровы сэнс, адносілі яе да пачатку дзевяностых.

Прыехаўшы да сваіх бацькоў, палезла па ўласны дзіцячы альбом. Стала цікава, а можа, Цёмік і на мяне малую чымсьці падобны!? І так і сяк разглядала маленькія тварыкі, параўноўваючы Цёмкавы фотаздымкі з маімі. Але, як ні прыглядайся, замест падабенства можна знайсці толькі сем адрозненняў. Затое на іншых старонках, дзе фотакартак ужо няма, але захаваліся маміны запісы, натрапіла на нешта цікавае. Чытаю і дзіву даюся: гэта ж пра майго Цёмку! Толькі не маёй рукой напісана. Ды не цяпер, а гадоў 27 таму...

«Стала вельмі шкодная». Гэта выказванне мяне ўвогуле здзівіла. Я, белая і пушыстая, у дзяцінстве ціхоня і сама паслухмянасць, як мне ўвесь час даказвалі бацькі, і раптам... шкодная! І цацкі я, у адрозненне ад Цёміка, пасля гульні збірала. Толькі навошта тады мама напісала, што я не люблю збіраць цацкі? Ці вось яшчэ: «Стала ўсюды залазіць: на крэсла, на стол, на канапу, ложак. Можа пераступіць з табурэта на крэсла, калі яны побач. Вельмі цікаўная». І тут акурат пра майго Арцёмку напісана: «Есць дрэнна. Вельмі любіць ягады, агуркі». «Дзеці плачуць ад яе прысутнасці», — мама, гэта дакладна пра мяне, тую, з якой, па вашых словах, ніколі не было праблем?!

Так што трэба яшчэ падумаць, на каго наш сынок падобны. Муж, па аповедах сваёй мамы, таксама быў жулік жулікам, якога нельга было пакінуць ні на хвіліну без нагляду. Як цяпер смяецца яго брат, у Дзімы з'явілася ўнікальная магчымасць паглядзець на сябе малога збоку. Але свякроў прызнаецца, што наш Цёмік па шкоднасці нават свайго бацьку пераплюнуў.

Ды якая розніца, чыіх генаў у гэтага маленькага шкодніка больш? Галоўнае, каб ён не хварэў і вырас годным, прыстойным чалавекам, за якога ніколі не будзе сорамна. А калі стане такі ж высокі, адказны і няўрымслівы, як бацька, дык гэта да лепшага. Не супраць будзем, калі, як і маці, будзе любіць вучыцца, людзям старацца дапамагчы. Часам нават самыя вялікія шкоднікі становяцца даволі неблагімі людзьмі.

Вераніка КАНЮТА.

Альфа-Банк

Закрытое акционерное общество «Альфа-Банк»

220013, Минск, ул. Сурганова, 43–47,
тел.: (017) 217-64-63, 217-64-59, факс (017) 200-59-29
Телекс 252190 ITIB BY, SWIFT ALFA BY 2X

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС по состоянию на 01.10.2019

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	2019	2018
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	60280	53468
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		
4	Средства в Национальном банке	1103	447165	588556
5	Средства в банках	1104	253791	38705
6	Ценные бумаги	1105	274997	126174
7	Кредиты клиентам	1106	1529803	1441482
8	Производные финансовые активы	1107	6499	3497
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	71212	70989
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	3908	9725
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	2435	2463
13	Отложенные налоговые активы	1112		
14	Прочие активы	1113	16009	19106
15	**ИТОГО АКТИВЫ**	**11**	**2666099**	**2354165**
16	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
17	Средства Национального банка	1201		
18	Средства банков	1202	133875	214328
19	Средства клиентов	1203	1971779	1624986
20	Ценные бумаги банка	1204	160172	168256
21	Производные финансовые обязательства	1205	2854	1540
22	Отложенные налоговые обязательства	1206		
23	Прочие обязательства	1207	40761	44094
24	**Всего обязательства**	**120**	**2309441**	**2053204**
25	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**			
26	Уставный фонд	1211	101369	101369
27	Эмиссионный доход	1212		
28	Резервный фонд	1213	29807	26007
29	Фонды переоценки статей баланса	1214	33556	33621
30	Накопленная прибыль	1215	191926	139964
31	**Всего собственный капитал**	**121**	**356658**	**300961**
32	**ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**	**12**	**2666099**	**2354165**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ по состоянию на 01.10.2019

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	2019	2018
1	Процентные доходы	2011	147905	112968
2	Процентные расходы	2012	57037	39300
3	**Чистые процентные доходы**	**201**	**90868**	**73668**
4	Комиссионные доходы	2021	69617	52393
5	Комиссионные расходы	2022	11874	11124
6	**Чистые комиссионные доходы**	**202**	**57743**	**41269**
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	-166	-88
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	37096	28462
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	7805	8642
11	Чистые отчисления в резервы	207	14362	27864
12	Прочие доходы	208	6399	4052
13	Операционные расходы	209	100862	87292
14	Прочие расходы	210	8277	6472
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	76244	34377
16	**Расход (доход) по налогу на прибыль**	**212**	**20547**	**6855**
17	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	**2**	**55697**	**27522**

Председатель Правления В. С. Смоляк

Главный бухгалтер А. В. Скрипка

Дата подписания: 7 октября 2019 г. УНП 101541947

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ЗАО «Центр промышленной оценки» сообщает о проведении 12 ноября 2019 года повторных электронных торгов в 11.00 по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Свитязь»

Количество лотов	Наименование имущества	Начальная цена продажи без НДС, бел. руб.	Задаток	Шаг аукциона
23	Извещения о проведении электронных торгов и подробные сведения о реализуемых лотах (оборудование, транспортные средства) размещены на сайте **www.bankrot.gov.by** (в разделе «Должники», «ОАО «Свитязь», «Реализация») и электронной торговой площадке **ipmtorgi.by**	Указана на сайте **www.bankrot.gov.by**	10 %	Фиксированная сумма, составляющая 5 % от начальной цены по каждому лоту (указана на сайте **www.bankrot.gov.by**)

Срок подачи заявок на участие в торгах: по **11.11.2019 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by).**
Место расположения имущества: Гомельская обл., г. Рогачев, ул. Белинского, 54А. С имуществом можно ознакомиться в рабочие дни с 09.00 до 16.00. Звонить по тел. +375 (29) 696-70-06.
Список реализуемого имущества и подробная информация о порядке проведения аукциона размещены на сайте www.bankrot.gov.by и ipmtorgi.by УНП 400241807

Извещение о проведении 92-го открытого аукциона по продаже земельных участков в Солигорском районе 25 ноября 2019 г.

№ лота	1	2	3
Предмет аукциона	Право заключения договора аренды земельного участка		
Адрес земельного участка	**Минская обл., Солигорский р-н, Чижевичский с/с, п. Хвалево, ул. Центральная, 10А**	**Минская обл., Солигорский р-н, Чижевичский с/с, п. Хвалево, ул. Центральная, 6Б**	**Минская обл., Солигорский р-н, Старобинский с/с, д. Поварчицы, по улице Советская**
Кадастровый номер	625085411601000116	625085411601000117	625086202101000352
Площадь, га	0,1354	0,1353	0,0742
Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества (целевое назначение)	Размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома)		Размещение объектов розничной торговли (строительство и обслуживание магазина)
Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории*	Имеется подъезд с песчано-гравийным покрытием, возможность подключения к сетям электроснабжения, газоснабжения, связи		Имеются асфальтированные подъездные пути, возможность подключения к сетям электроснабжения, газоснабжения, связи
Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений	Земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, – 0,0046 га	Земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, – 0,0048 га	Земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, – 0,0036 га
Начальная цена продажи, руб.	1 084,18	1 083,38	212,54
Сумма задатка, руб.	216,00	216,00	42,00
Срок аренды земельного участка / условия продажи	30 лет / см. пункт 6		20 лет / см. пункт 6
Затраты на организацию и проведение аукциона, руб.	2 411,03	2 463,29	3 345,40
	+ затраты на объявление в СМИ		

*в разделе указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.

Продавец: Солигорский районный исполнительный комитет (далее – райисполком), 223710, г. Солигорск, ул. Козлова, 35.
Порядок проведения аукциона и порядок оформления участия в торгах определяются Гражданским кодексом Республики Беларусь, Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.
1. **Аукцион состоится в 15.00 25 ноября 2019 г.** по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 35, зал заседаний райисполкома.
2. Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы:
2.1. заявление на участие в аукционе по установленной форме; при подаче заявления представитель юридического лица должен иметь паспорт, доверенность на участие в аукционе и на подписание документов, физическое лицо (или его представитель, участвующий в аукционе по нотариально удостоверенной доверенности) – паспорт;
2.2. копии устава, учредительных документов, свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов (для юридического лица), копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования (для индивидуальных предпринимателей), копию паспорта, выписку об открытии в филиале 633 АСБ «Беларусбанк» лицевого счета для возврата задатка (для физических лиц);
2.3. документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на расчетный счет райисполкома (УНН 601061003) № BY75 AKBB 3641 0000 0429 7660 0000 в филиал 633 АСБ «Беларусбанк», БИК AKBBBY21633, с отметкой банка, не позднее срока окончания приема документов на участие в аукционе – 19 ноября 2019 г.;
2.4. гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо заключает с райисполкомом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по установленной форме.
3. По лотам № № 1–3 осуществляется ежегодная уплата арендной платы согласно кадастровой стоимости земельного участка и его целевому назначению.
4. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с земельными участками и документацией. Осмотр земельных участков осуществляется претендентами на участие в аукционе самостоятельно либо в сопровождении специалиста управления землеустройства райисполкома в согласованное время (рабочие дни) в течение установленного срока приема документов.
5. Аукцион по каждому лоту состоится при наличии не менее двух участников. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов максимальную цену.
6. Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:
подписать протокол аукциона в день проведения аукциона;
в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату за предмет аукциона (в счет оплаты засчитывается сумма внесенного задатка), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения;
не позднее 2 рабочих дней после совершения оплаты заключить с районным (сельским) исполнительным комитетом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок после его заключения государственную регистрацию права на земельный участок;
в течение одного месяца со дня осуществления государственной регистрации права на земельный участок обратиться в райисполком для получения разрешительной документации на проектирование и строительство объекта;
обеспечить соблюдение требований градостроительного паспорта земельного участка при осуществлении проектирования и строительства;
в течение двух месяцев после получения разрешительной документации на проектирование и строительство объекта заключить договор подряда на выполнение проектных работ;
обеспечить разработку проектно-сметной документации в сроки, установленные Положением о порядке определения продолжительности разработки проектной документации на строительство зданий и сооружений, утвержденным приказом Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь от 16 февраля 2005 г. № 40;
согласовать и утвердить в установленном порядке разработанную проектно-сметную документацию в течение трех месяцев;
юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю не позднее 6 месяцев, а гражданину не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к освоению земельного участка;
осуществить строительство жилого дома – в сроки, установленные законодательством, иного объекта – в сроки, определенные проектно-сметной документацией;
возместить в установленном порядке затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к предоставленному земельному участку в соответствии с частью третьей подпункта 1.7 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».
7. Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 35, кабинет 244, с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по рабочим дням со дня опубликования настоящего извещения и по 19 ноября 2019 г. включительно. Контактные телефоны: 8 (0174) 22 77 46, 22 55 23.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Хойникский комбинат бытового обслуживания» (продавец) в лице председателя ликвидационной комиссии Степаненко Д. А. извещает о проведении 6 ноября 2019 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 10 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
Условие продажи: Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества			
	Местонахождение лотов: г. Гомель, ул. Б. Хмельницкого, д. 77		
1	**Автомобиль VAZ-21070**, год выпуска – 2007, рег. № 2892 ЕВ-3 тип ТС – легковой седан, цвет темно-зеленый	**2 160,00**	216,00
2	**Автомобиль GAZ-2705**, год выпуска – 2003, рег. № АК 7243-3 тип ТС – грузопассажирский вагон, цвет – белый	**3 150,00**	315,00

Продавец: ОАО «Хойникский комбинат бытового обслуживания», Гомельская область, г. Хойники, ул. К. Маркса, 27. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (029) 690-00-10 – Беланов Руслан Николаевич. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 24 октября 2019 г.** по адресу:
г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 4 ноября 2019 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за **3 (три) дня** до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене**, увеличенной на 5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с постановлением Совета Министров РБ от 08.01.2013 № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 08.08.2019 г. № 148 (29015). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация – по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

Открытое акционерное общество «Небанковская кредитно-финансовая организация «Белинкасгрупп»

(www.belincasgroup.by)

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2019 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	На 01.10.2019	На 01.01.2019
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		2 544	-
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		-	-
4	Средства в Национальном банке	1103		226	295
5	Средства в банках	1104		43 387	34 061
6	Ценные бумаги	1105		-	8 983
7	Кредиты клиентам	1106		1	-
8	Производные финансовые активы	1107			-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		39 034	36 156
11	Доходные вложения в материальные активы	1110		30 798	40 592
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111		-	-
13	Отложенные налоговые активы	1112		-	-
14	Прочие активы	1113		6 410	1 157
15	**ИТОГО активы**	**11**		**122 400**	**121 244**
16	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
17	Средства Национального банка	1201		-	-
18	Средства банков	1202		-	-
19	Средства клиентов	1203		-	-
20	Ценные бумаги банка	1204		-	-
21	Производные финансовые обязательства	1205		-	-
22	Отложенные налоговые обязательства	1206		-	-
23	Прочие обязательства	1207		3 587	926
24	**ВСЕГО обязательства**	**120**		**3 587**	**926**
25	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
26	Уставный фонд	1211		121 002	121 002
27	Эмиссионный доход	1212		-	-
28	Резервный фонд	1213		-	-
29	Фонд переоценки статей баланса	1214		-	-
30	Накопленная прибыль	1215		(2189)	(684)
31	**ВСЕГО собственный капитал**	**121**		**118 813**	**120 318**
32	**ИТОГО обязательства и собственный капитал**	**12**		**122 400**	**121 244**

ОТЧЕТ о прибылях и убытках на 1 октября 2019 года

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	На 01.10.2019	На 01.10.2018
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		3 166	1316
2	Процентные расходы	2012		-	-
3	Чистые процентные доходы	201		3 166	1316
4	Комиссионные доходы	2021		8024	-
5	Комиссионные расходы	2022		3	1
6	Чистые комиссионные доходы	202		8021	(1)
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		-	-
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		-	-
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		-	-
11	Чистые отчисления в резервы	207		2	197
12	Прочие доходы	208		15 657	2430
13	Операционные расходы	209		28 347	3508
14	Прочие расходы	210		-	1
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		(1505)	39
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		-	-
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		(1505)	39
18	Сведения о прибыли на одну акцию в рублях				
19	Базовая прибыль на простую акцию	22			
20	Разводненная прибыль на простую акцию	23			

Председатель Правления А. С. Посканной

Главный бухгалтер Н. А. Ероховец

Дата подписания: 10 октября 2019 г. УНП 807000270

ООО «ДЕСЯТКА-СТРОЙ» сообщает о проведении 26.11.2019 торгов в форме открытого аукциона по продаже следующего имущества: 1) Колеровочная машина CXEX E5 Dosieranlage, инв. № 556 – 6 020,00 белорусских рублей; 2) Колеровочная установка TEKNOMIX 50, инв. № 356 – 4 010,00 белорусских рублей; 3) Колеровочная машина CX-Maschine CX-Rohanlage/TM300, инв. № 300 – 4 570,00 белорусских рублей; 4) Колеровочная установка TEKNOMIX 50, инв. № 354 – 3 870,00 белорусских рублей. Подробную информацию можно узнать на сайте bankrot.gov.by.

УНП 190593406

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП почтовой связи «Белпочта» (продавец) извещает о проведении 26 ноября 2019 года открытого аукциона по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование лотов	Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС (20 %)	Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС (20 %)
1	**Помещение площадью 20,7 кв. м**, в 3-этажном здании РУПС (инв. № 340/С-28644), расположенное на 3-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент местоположения – 1,0. **Адрес:** г. Речица, ул. Советская, 66	**87,46**	8,75
2	**Помещение площадью 122,8 кв. м (114,5; 8,3)**, в здании отделения связи (инв. № 340/С-4428), расположенное на 2-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,2. Коэффициент местоположения – 0,9. **Адрес:** г. Гомель, пр-т Октября, 81	**518,83**	51,88
3	**Помещение площадью 70,67 кв. м (15,03; 19,97; 35,67)** в изолированном помещении – помещении отделения почтовой связи с инв. № 340/D–35161, помещение на 1-м этаже. Коэффициент спроса – 3,0. Базовая ставка – 0,25. Коэффициент местоположения – 1,0. **Адрес:** г. Мозырь, б-р Юности, 39б	**298,58**	29,86

Сведения о продавце	Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8, тел. 8 (0232) 79-67-44
Срок подачи заявления	С **24.10.2019 г. по 22.11.2019 г.** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга». **Подача документов по почте не допускается.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения
Номер р/с для перечисления задатка	BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000 в филиале № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, ул. Барыкина, 94, BIC AKBBBY21302, УНП 400395996, **получатель – Гомельский филиал РУП почтовой связи «Белпочта»,** назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах за лот № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)
Условия пользования	Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, организация производства (кроме вредных производств)
Размер штрафа	Лот № 1 – 1 базовая величина; лот № 2 – 10 базовых величин; лот № 3 – 2 базовых величины, согласно Указа Президента РБ от 10.01.2013 г. № 14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги от условий проведения аукционных торгов, согласно действующего законодательства)

Срок договора аренды – 5 (пять) лет, шаг аукциона – 10 (десять) %. К участию допускаются только индивидуальные предприниматели или юридические лица. Необходимо в адрес Организатора торгов подать заявление по установленной форме, подписать соглашение с Организатором торгов и предоставить необходимые документы: копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представитель юридического лица или индивидуального предпринимателя предъявляет оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица). При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 г. № 150 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. В случае единственного участника торгов ему будет предложено приобрести лот по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов**. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), в течение **10 (десяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **5 (пяти) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества. Аукцион проводится в соответствии Положения «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности. **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

РУП «Торговый дом «Восточный» снимает с аукциона, который состоится 31.10.2019 **Лот № 18.** Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-10150 общей площадью 55,0 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Логойский р-н, Острошицкий с/с, СТ «Связист», в/ч 06468, 66. Назначение: садовый, дачный домик (дача), наименование: садовый домик. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623286300006000073 площадью 0,0450 га. **Начальная цена продажи – 11 790,00 бел. руб, задаток – 1 179,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.** Извещение о проведении аукционных торгов было опубликовано 02.10.2019 в печатных средствах массовой информации – газета «Звязда» № 187.

УНП 101127633

ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: **ОАО «Гомельторгмаш»** (УНП 400069563) 246034, г. Гомель, ул. Владимирова, 14, в лице управляющего в деле о банкротстве Кудели Игоря Леонидовича, тел. +375 (29) 687-19-90.

Повторные публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) (далее – торги) будут проведены **6 ноября 2019 г**. 09.00–17.00 на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена, бел. руб. с НДС
9665	Станок вертикально сверлильный пазовальный СВА – 2 (44502) (01.01.76), инв. № 44745	550,80
9666	Станок фрезерный по дереву ФС (44505) (01.12.77), инв. № 44750	972,00
9667	Станок универсальный станок 1УН (44500) (01.01.76), инв. № 44742	1404,00
9668	Станок горизонтально-фрезерный 6РВ2Г (41001) (01.01.86), инв. № 41343	2700,00
9670	Машина стыковой сварки МС-502 (42503) (01.12.78), инв. № 42634	853,20
9671	Установка сварочная универсальная УДГУ-302 (42502) (01.10.01), инв. № 42647	550,80
9672	Ножницы гильотинные Н-3218Б (41200) (01.06.79), инв. № 41381	4212,00
9673	Станок токарно-винторезный 1М63 (41001) (01.09.82), инв. № 41231	4212,00
9674	Станок токарно-револьверный 1341 (41001) (01.04.77), инв. № 41238	6696,00
9675	Резьбонакатный станок А-9518 (41001) (01.12.84), инв. № 41323	3348,00
9676	Пресс КД2324 (41200) (01.06.89), инв. № 41442	4212,00
9677	Автомат правильно-отрезной И-6118 (41200) (01.12.83), инв. № 41396	4752,00
9678	Автомат правильно-отрезной И 6118 (41200) (01.09.76), инв. № 41393	4752,00
9679	Пресс-ножницы Н-5222 (41200) (01.12.80), инв. № 41382	2700,00
9680	Станок координатно-расточной 2431 (41001) (01.01.76), инв. № 41282	4212,00
9681	Радиально-сверлильный станок 2Н 55 (41001) (01.01.76), инв. № 41252	3564,00
9682	Станок токарно-винторезный SUI - 402000 (41001) (01.09.83), инв. № 41235	9180,00
9684	Станок горизонтально-фрезерный 6Р82Г (41001) (01.01.76), инв. № 41342	2700,00

Местонахождение – г. Гомель, ул. Владимирова, 14. Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698 53 03.

Для участия в торгах необходимо в срок по 05.11.2019 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY**; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого, между продавцом и победителем торгов в течение пяти рабочих дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи. Срок оплаты предмета торгов: не позднее 7 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 14.08.2019 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении электронных торгов

Гродненское областное потребительское общество объявляет о проведении повторных электронных торгов по продаже недвижимого имущества:

1. **Аукцион № 2348, Лот № 12078**

• капитальное строение с инвентарным номером 451/С-14959 площадью – 213,2 м², целевое назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – **кондитерский цех**, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. Дятлово, ул. Горького, д. 3.

Канализация и водопровод – центральные. Горячее водоснабжение – автономное. Отопление – центральное.

Начальная цена лота: 18 720,00 руб. с НДС.

Дата и время начала торгов: **22.10.2019, 10.59.**

Дата и время окончания торгов: **05.11.2019, 10.59.**

2. **Аукцион № 2349, Лот № 12076**

• капитальное строение с принадлежностями, инвентарный номер 451/С-13662 площадью – 106 м², назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – **столовая № 1**, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. Дятлово, ул. Слонимская, д.1;

• капитальное строение, инвентарный номер 451/С-15624, протяженность линейного сооружения – 6,0 м, целевое назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **водопроводная сеть**, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. Дятлово, ул. Слонимская, д.1;

• капитальное строение, инвентарный номер 451/С-15623, протяженность линейного сооружения – 123,9 м, целевое назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **канализационная сеть**, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. Дятлово, ул. Слонимская, д. 1.

Канализация и водопровод – центральные. Горячее водоснабжение – автономное. Отопление – местное.

Начальная цена лота: 18 220,80 руб. с НДС.

Дата и время начала торгов: **22.10.2019, 10.58.**

Дата и время окончания торгов: **05.11.2019, 10.58.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном правилами торгов электронной торговой площадки РУП «Информационный центр Минэкономики», размещенными по адресу: **www.torgi.gov.by**.

Задаток – 10 % от стоимости лота перечисляется на счет электронной торговой площадки.

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты продавцу на проведение аукциона в размере 3 % от суммы продажи лота в течение 3 календарных дней со дня окончания торгов.

Срок заключения договора купли-продажи – 10 календарных дней со дня окончания торгов.

Оплата предмета торгов: не позднее 30 календарных дней со дня окончания торгов за вычетом внесенного задатка.

С документацией на недвижимость можно ознакомиться на электронной торговой площадке www.torgi.gov.by, а также у продавца в рабочее время.

Контактные телефоны: 8 (01563) 25271 – юрисконсульт, 21682 – приемная.

УНП 590959404

На «зорным» лецішчы

Валерый ДАЙНЕКА: «Дом на беразе ракі — мара рыбака»

Заслужаны артыст БССР, саліст ансамбля «Беларускія песняры» Валерый Дайнека жыве ў Мінску з чатырох гадоў, але заўсёды падкрэслівае, што яго радзіма — горад Беразіно. Там і цяпер ўся радня музыканта. Менавіта на беразе, як запэўнівае Валерый, самай прыгожай і любімай ракі — Бярэзіны — ён паставіў дом. Праўда, «пясняр» кажа, што будоўля — вечны працэс.

З дочкамі, зяцямі, унукамі.

— Як заўзяты рыбак, марыў пра загарадны дом на беразе рэчкі, — апавядае Валерый. — Мой брат Генадзь практычна ўсё жыццё працаваў піяністам на круізных лайнерах, а калі сышоў на сушу, то захацеў па-сапраўднаму «зазямліцца». Дарэчы, ён працуе да гэтага часу, але ўжо ў Бярэзінскай музычнай школе канцэртмайстрам. Брат набыў дом у вёсцы Божына, недалёка ад Беразіна. Хата была вельмі старая, такія звычайна купляюць дзеля ўчастка. Вось і Гена знёс яе, а на тым месцы пабудаваў новы дом, абзавёўся сапраўднай гаспадаркай.

Неяк брат патэлефанаваў мне і падказаў месца, дзе можна было набыць пусты ўчастак. Усё сышлося: на радзіме, побач з братам і на беразе ракі. Аднак калі я прыехаў паглядзець участак, то рэчкі не ўбачыў! Зарослы бераг быў закіданы пластыкавымі бутэлькамі, будаўнічым смеццем...

Сябры нават адгаворвалі пачынаць тут будоўлю. Але я ўсё ж адважыўся.

— Доўга разважалі: дрэва, цэгла ці блокі?

— Да таго часу я ўжо бываў у драўляных дамах сваіх сяброў і захацеў сабе такі ж. У ім выдатна дыхаецца. Летам — прахалодна, зімой — цёпла. У мяне тут яшчэ невялікая печка і камін!

Цяпер, праз шэсць гадоў, я разумею, што драўляны дом стварае больш праблем, чым, напрыклад, цагляны. Нягледзячы на тое, што ўвесь зруб быў апрацаваны адмысловым антысептыкам, які абараняе дрэва ад цвілі і насякомых, тым не менш даводзіцца амаль кожны год пазбаўляцца ад усіх відаў яго хвароб. Драўляны дом — гэта жывы арганізм, які патрабуе пастаяннага лячэння.

— Ці хутка будаваліся?

— Зруб ставяць даволі хутка, і лепш гэта рабіць зімой. Затым трэба даць час на яго ўсадку, а гэта пару гадоў як мінімум! І толькі потым я ўжо ўстаўляў дзверы, вокны..

Ну і, безумоўна, хуткасць будоўлі залежыць ад фінансавання. А даходы артыста нестабільныя, цяжка планаваць нешта на перспектыву. Але паволі пабудаваўся, цяпер вось яшчэ і лазню збіраюся паставіць.

— Тут райскае месца — бярозкі на ўчастку, нібы ў гаі. Невялікі агародзік, сад, кусты розных ягад...

— Усе гэтыя бярозкі — самасейкі, але я ніводнай не ссек, і атрымалася ўсё ўдала. У маім гаі нават грыбы раслі. Знайшоў я і дубок, яму таксама вызначыў месца. А хвоі самі выраслі каля бяроз. Кедр, лістоўніцу, дзясятак туй і мора кветак — гэта ўсё набыў у садовых цэнтрах, а таксама маліну і вінаград.

— А ці не хочаце дуб назваць імем унука?

— Добрая ідэя. Дуб Крысціян, а тры сасонкі — унучкі Ярослава, Жызэль і Лучана.

— Старэйшая дачка Яна жыве ў Маскве, малодшая Віка — у Маямі. А тут яны былі?

— Пачнём з таго, што менавіта ў гэты дом прыязджаў з Амерыкі Майк, тады яшчэ жаніх Вікі, прасіць яе рукі. З Янай і Ясекай — так мы клічам старэйшую ўнучку — не заўсёды атрымліваецца сустрэцца ў Маскве. Дачка працуе ў «Новых самацветах», і гурт актыўна гастралюе. Але вось тут мне ўдаецца сабраць разам дзяцей і ўнукаў. Калі яны прыязджалі мінулым летам, то нават у мінскую кватэру не зазіралі, адразу з аэрапорта — сюды, і з вёскі — у аэрапорт!

— Амерыканскаму зяцю тут спадабалася?

— А чаму толькі зяцю? Сваты таксама гасцявалі. Усім спадабалася.

— Як праходзіць звычайны дзень на дачы?

— На світанку часам ідзём з братам на рыбалку. Але ў нас тут вельмі шмат работы, і не заўсёды гэта магчыма. Дом на беразе ракі — мара рыбака. Вельмі зручна. Раней як было? У дзве гадзіны ночы пад'ём, загрузілі лодку, снасці ў машыну — і ў дарогу. Цяпер выйшаў за брамку — і можна рыбачыць. Але ў нас ёсць любімыя месцы далей ад вёскі, і туды дабіраемся на лодцы або на машыне.

— Госці сюды часта прыязджаюць?

— Так, сябры бываюць, і ўсім тут падабаецца. У нас вельмі прыгожая і шчодрая прырода. Некаторыя ў добры сезон збіраюць па некалькі кошыкаў грыбоў.

— Вялікі запас насечаных дроў, падстрыжаны газон... Чыіх рук справа? Памочнікі з мясцовых або сябры дапамагаюць? Вось хто зімой працеплівае дом, пакуль вы на гастролях?

Фрагмент інтэр'ера дома.

— Сябры дапамагаюць з'есці маю фірмовую рыбу. Жартую. Вядома, часам дапамагаюць па гаспадарцы. Ёсць і ў вёсцы працавітыя хлопцы, але да іх — чарга. Я сам з задавальненнем стрыгу газон, сяку дровы — гэта няцяжка, тым больш што ёсць тэхніка. І зімой дом жыве. У наш час няма такіх гастроляў, як былі ў СССР, — тады мы з'язджалі на 3-4 тыдні. Цяпер максімум 2-3 дні адсутнічаю. Прыязджаю і ўзімку, палю ў печы, расчышчаю сцежкі ад снегу і атрымліваю ад усяго гэтага каласальнае задавальненне!

Аксана ЯНОЎСКАЯ.
Фота з архіва Валерыя ДАЙНЕКІ.

Дом.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

КУРЫЦА З БАКЛАЖАНАМІ ПА-КІТАЙСКУ

Спатрэбіцца: *філе курыных грудак — 800 г, баклажаны сярэдняга памеру — 4 шт., соевы соус — 2 ст. л., яблычны воцат — 2 ст. л., цукар — 3 ст. л., надзёрты свежы імбір — 1 ст. л., кунжут (па жаданні) — 1 ч. л., кукурузны крухмал — 2 ч. л. (або 1 ч. л. бульбянога), часнок — 1 зубчык, чырвоны востры перац на кончыку нажа, алей.*

Курыцу наразаем доўгімі палоскамі таўшчынёй 1 см. Баклажаны — доўгімі брусочкамі. У некалькі партый абсмажваем кураціну на алеі на моцным агні, пакуль мяса ўнутры не перастане быць ружовым. Выкладваем на талерку і адстаўляем убок.

Кладзём у патэльню, дзе смажылася курыца, баклажаны, дадаём імбір, часнок і 50 мл вады, даводзім да кіпення. Памяншаем агонь да сярэдняга, накрываем патэльню вечкам і смажым, перыядычна памешваючы, пакуль вадкасць не выпарыцца, а баклажаны не будуць гатовыя.

У асобным посудзе змешваем соевы соус, воцат, кунжут, крухмал, перац і цукар.

Курыцу кладзём на патэльню да баклажанаў, заліваем соевай сумессю і на моцным агні даводзім да кіпення. Затым памяншаем агонь і смажым, памешваючы, пакуль падліўка не загусне.

Гатовую страву лепш за ўсё падаваць з рысам.

ПАМІДОРЫ Ў СЫРНЫМ КЛЯРЫ

Спатрэбіцца: *цвердаватыя памідоры — 4 шт., сыр — 150 г, смятана — 2 ст. лыжкі, яйкі — 2 шт., сушаная молатая папрыка, часнок молаты або свежы, надзёрты на дробнай тарцы, чорны ці чырвоны молаты перац.*

Памідоры памыць, апусціць на некалькі секундаў у кіпень, зняць скурку. Нарэзаць кружочкамі, пасыпаць папрыкай, часнаком, чорным ці чырвоным перцам.

Для кляру: *узбіць 2 яйкі, змяшаць са смятанай, дадаць дзёрты сыр, усё яшчэ раз старанна змяшаць.*

Памідоры акунаць у кляр і смажыць на добра разагрэтай патэльні з антыпрыгарнай паверхняй (або на звычайнай) на алеі да залацістай скарыначкі.

Раскачаць цеста і вылажыць у форму для выпякання, затым пакласці нарэзаныя яблыкі.

Для крэму змяшаць шклянку смятаны, шклянку цукру, яйка і 2 ст. л. мукі, узбіць міксерам. Атрыманы вадкі крэм выліць на цеста з яблыкамі і выпякаць пірог пры тэмпературы 200 градусаў 45-50 хвілін.

Астудзіць і пасыпаць цукровай пудрай.

ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ

НЕ ПА ПРЫЗНАЧЭННІ, АЛЕ...

Жыццё капронавых калготак кароткае, і жанчыны пра гэта выдатна ведаюць. «Стрэлкі», зацяжкі, парывы — усё гэта прамая дарога ва ўтыль. Аднак такое рашэнне — не самае рацыянальнае. Старыя, пашкоджаныя калготкі ці панчохі можна працягваць выкарыстоўваць.

✓ Аказваецца, гэта зручны матэрыял для чысткі абутку. Калготкі з поспехам замяняюць абутковыя шчоткі: начышчаны абутак блішчыць нібы адпаліраваны.

✓ У панчоху можна пакласці далікатныя рэчы перад мыццём. У такім выглядзе захаванасць бялізны пасля мыцця гарантавана.

✓ Калготкі — альтэрнатыва губкам для мыцця посуду.

✓ Скамечаная панчоха — выдатная мачалка.

✓ Калготкамі можна памыць шкло, люстэрка і нават адпаліраваць мэблю.

✓ Абцягніце панчохай качалку, і ў вас не будзе праблем з прыліпаннем цеста пры яго раскочванні.

✓ Напоўненая цыбуляй або часнаком панчоха ў падвешаным стане выдатна захоўвае гэтыя дары прыроды.

✓ Матэрыял калготак выдатны для праціравання далікатных лісточкаў хатніх раслін ад пылу.

✓ На садовым участку, калі трэба намыліць рукі, каб не запэцкаць мыла ў зямлі, можна пакласці яго ў панчоху. Другі канец панчохі прымацаваць да ўмывальніка.

БЫЎ БЫ САД, А САЛАЎІ ПРЫЛЯТУЦЬ (беларуская народная прымаўка)

СЛЕД НА ЗЯМЛІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Уладзімір Слесараў дакладна ведае адказ на пытанне, для чаго яму ўсё гэта і чаму наогул ветэран Афганістана займаецца справамі даўно мінулых дзён. Прычыны, калі хочаце, ідэалагічнага кшталту. Перадусім гэтае жаданне не страціць гістарычную памяць, навесці масты паміж пакаленнямі.

— У мяне аднойчы чалавек пры высокай пасадзе спытаў: маўляў, навошта нам адраджаць памяць пра вайну 1812 года, беларусы ад яе толькі пацярпелі. А хіба хтосьці іншы быў ад яе шчаслівы? Можа, Масква, якая не запрашала да сябе французаў — гэта быў адкрыты акт агрэсіі з боку Напалеона? Альбо тыя рускія салдаты, якіх ніхто не спытаў, ці хочуць яны ў холад і голад ісці ў паўночна-заходні край імперыі, у беларускія балоты, каб выгнаць адсюль непрыяцеля? А мо шараговыя французскія салдаты, якія ваявалі і гінулі па загадзе, за чужыя планы і памкненні?.. З іншага боку, беларусы ў складзе тагачаснай Расійскай імперыі сталі пераможцамі ў вайне 1812 года, і нельга на гэта забывацца. Дык вось, каб такіх пытанняў і домыслаў, у тым ліку вакол нашай агульнай Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, не ўзнікала — ні ў Беларусі, ні ў Расіі, ні ў Германіі, ні ў Францыі, — у гэтым кірунку, на маю думку, неабходна працаваць. Чым я і планую заняцца, пагадзіўшыся на пасаду кіраўніка прадстаўніцтва Расійскага ваенна-гістарычнага таварыства (такія прадстаўніцтвы, дарэчы, дзейнічаюць у 80 краінах свету). Што канкрэтна мы будзем рабіць? Не перапісваць гісторыю, але аб'ектыўна гаварыць пра яе і маленькімі крокамі аднаўляць той разрыў пакаленняў, які ўзнік. Бо пакаленні, якія змагаліся і перамагалі, мы ўжо не вернем. А чакаць новай вайны, каб яно сфарміравалася, — што называецца, крый божа. Значыць, трэба знаходзіць у моры інфармацыі той пазітыўны вопыт, які быў, і фарміраваць у моладзі аб'ектыўнае светаўспрыманне, якое не змогуць пахіснуць сучасныя маніпулятары рознага кшталту.

Напоўніць форму зместам

Мецэнат прызнаецца: канструкцыя сядзібы Івана Каладзеева, тады яшчэ проста недагледжанага дома № 8 па вуліцы 30 гадоў ВЛКСМ у Барысаве, пачалася зусім не як справа гонару і аднаўлення гістарычнай справядлівасці, а як камерцыйны праект — Указ № 108 2007 года дазваляў набываць усяго за адну базавую велічыню ці нават бязвыплатна атрымліваць пад канкрэтныя інвестыцыйныя праекты дзяржмаёмасць, якая не выкарыстоўвалася. «Калі ўпершыню мы зайшлі ў гэты будынак, я так і меркаваў: адрамантаваны дом можна будзе прадаць або залажыць, перабудаваць, нарэшце, жыць тут, — згадвае прадпрымальнік. — Кіраўніцтва горада папрасіла нас, каб да 200-годдзя вайны 1812 года сядзібу можна было камусьці паказаць. Але, увязваючыся тады ў справу, я не ўяўляў аб'ём работы — больш за тое, нават маштаб асобы Івана Хрысанфавіча Каладзеева не ўяўляў. Гэты маштаб вызначаюць справы — ну не можа дробны, нікчэмны чалавек збудаваць храм, якім усе захапляюцца! Вось і для мяне маштаб Каладзеева як чалавека, калекцыя якога па напалеоніцы стала самай вялікай у Еўропе, раскрываўся паступова, спачатку ж я проста выконваў пастаўленую задачу — паспець да 2012 года рэканструяваць сядзібу. Удакладню: гаворка не ішла аб рэстаўрацыі з захаваннем гістарычнай дакладнасці, проста аднаўленне сядзібы ў стылі той эпохі. Бо смешна ж: у Барысаве даўно існуе бібліятэка, якая носіць імя Каладзеева, мы напаўняем форму зместам, а дом, у якім жыў выдатны чалавек, стаіць нікому не патрэбны!»

Сядзіба за свой век бачыла нямала: пасля смерці Івана Каладзеева ў 1914 годзе яго ўдава пераехала ў Еўропу, а ў будынку, які доўга стаяў закінуты, у савецкі час працавалі Дом дзіцяці, скурна-венералагічны дыспансер. І тым не менш пад слаямі старых шпалер і тынкоўкі падчас рэканструкцыі знайшлі абсалютна цэлы зруб, дзе-нідзе захаваліся арыгінальныя вокны і нават вонкавая разьба пад дахам. Выгляд з вуліцы з дапамогай мясцовых майстроў аднавілі паводле старых здымкаў і паштовак, што да ўнутранага аздаблення пакояў — паколькі сведчанняў пра тое, як яны выглядалі, не засталося, вырашылі не адмаўляцца ад сучасных тэхналогій, але пастарацца перадаць дух эпохі XIX — пачатку XX стагоддзя. Гасцей на ўваходзе сустракае партрэтная галерэя былых гаспадароў, вешалка з капелюшамі і гадзіннік з зязюляй, а зазірнуўшы ў пакоі, няцяжка паверыць, быццам стацкі саветнік толькі што выйшаў з рабочага кабінета — можа, у гасцёўню, адкуль даносяцца гукі піяніна, — а яго сябры праз імгненне працягнуць партыю ў шахматы. Акрамя таго, тут працуе пастаянная галерэя барысаўскіх мастакоў і экспазіцыя «Яўрэі Барысаўшчыны».

— Папаўняючы свой «Нова-барысаўскі збор кніг, рукапісаў, гравюр, планаў і картаў», Іван Каладзееў аб'ездзіў усе аўкцыёны Еўропы і быў гатовы заплаціць любыя грошы за патрэбны дакумент. Наколькі складаны працэс — вяртанне хоць часткі гэтага збору?

— Кіраўніком праекта аднаўлення сядзібы была Наталля Іванаўна Касперская, якая глыбока вывучала пытанне. Вялікую дапамогу аказалі Цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Каладзеева, аб'яднаны раённы музей, якія ўжо шмат гадоў мэтанакіравана і метадычна збіраюць усю інфармацыю, уніфармісты і іншыя ўдзельнікі клубаў гістарычнай рэканструкцыі, мясцовыя гісторыкі — можаце назваць усіх, не памыліцеся, бо раўнадушны нікто не застаўся. Не бяру на сябе лішнія заслугі: я проста ўзяў і аднавіў дом, але другое жыццё яму далі ўсе гэтыя людзі, якія і сёння працягваюць навуковыя даследаванні. Далей мы пайшлі ўжо асобным шляхам, бо сядзіба — не музей, не навуковая ўстанова, а спосаб расказаць і паказаць, чым было напоўнена жыццё славутага калекцыянера. Мы працуем, так скажам, на ўзор «ленініяны». Адна справа — проста расказаць, што ў Барысаве бывалі дзядзькі цара Мікалая, і зусім іншая — удакладніць: акурат на гэтым ганку яны стаялі, у гэтай альтанцы пілі чай, тут быў рабочы кабінет Каладзеева, тут прайшло яго жыццё.

Вялікае бачыцца здалёк

Уявіце сабе: Барысаў XIX стагоддзя — невялікае яўрэйскае мястэчка, і раптам тут, у глыбокай правінцыі, знаходзіцца чалавек, які адкрыў першыя помнікі рускім воінам на месцы пераправы каля вёскі Студзёнка, які сабраў унікальную калекцыю — звыш 15 тысяч кніг, брашур, альбомаў пра напалеонаўскія паходы на рускай, французскай, нямецкай, італьянскай мовах, каля 3200 прадметаў і мастацкіх твораў, звязаных з падзеямі 1812 года, — партрэтаў удзельнікаў бітваў, карт і планаў, рукапісаў, мундзіраў, зброі і г. д. Каладзееў перапісваўся з найбуйнейшымі бібліятэкамі і навуковымі часопісамі свету, з прыватнымі калекцыянерамі, сюды ішла каласальная колькасць карэспандэнцыі, сваімі пошукамі і збіральніцтвам Іван Хрысанфавіч зрабіў маленькі гарадок вядомым на ўвесь свет.

Частка яго калекцыі была падорана будучаму музею вайны 1812 года, яшчэ частка — «растварылася» ў гістарычнай і іншых публічных бібліятэках, магчыма, некалькі тысяч кніг захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

— Пра яго гавораць рознае: маўляў, быў карцёжнік і не проста так рана памёр, але, паўтаруся, уяўленне пра маштаб асобы даюць справы. Дзякуючы таму што мы ўвайшлі ў Расійскае ваенна-гістарычнае таварыства, мы атрымалі допуск у архівы і музеі і цяпер можам вывучаць захаваныя часткі калекцыі Каладзеева ў Маскве, — дзеліцца радасцю Уладзімір Слесараў. — Сёння ўсе шукаюць на сваёй зямлі славутых людзей, якія так ці інакш сфарміравалі гісторыю, — а ў Беларусі гэтыя людзі доўгі час знаходзіліся ў забыцці, ёсць магчымасць аднавіць і ўшанаваць памяць пра іх. А колькі яшчэ такіх незаслужана забытых людзей — у Барысаве, у Мінску, у іншых нашых гарадах і мястэчках! Давайце паглядзім, пашукаем. Я, напрыклад, раней не ведаў, што з барысаўскіх яўрэяў выйшла 19 дактароў навук, што імем барысаўчаніна названыя астравы, што сярод маіх землякоў такая вялікая колькасць вядомых творцаў. Магчыма, наступны мой крок будзе — сабраць калекцыю ўсіх сусветна вядомых барысаўскіх мастакоў: работы 32 (з 58) у галерэі ўжо ёсць...

Ёсць «яўрэйская зала» (узнікла цалкам выпадкова, проста не хапала матэрыялу для экспазіцыі, і мы звярнуліся па дапамогу да яўрэйскай абшчыны), і я бачу, як яны ставяцца да сваёй гісторыі: глядзяць на тое, што ў нас ёсць, і звяраюць са сваімі звесткамі, а потым са старшынёй мясцовай яўрэйскай абшчыны ўдакладняюць па канкрэтных адрасах — хто дзе жыў, чым займаўся і г. д. З Аўстраліі, з Нарвегіі, з ЗША — напэўна, з усяго свету сюды едуць спадчыннікі мясцовых ураджэнцаў і настолькі жыва цікавяцца сваёй гісторыяй, што гэта выклікае павагу і захапленне, жаданне вучыцца. Бо, аказваецца, памяць і гісторыя цалкам матэрыяльныя і вельмі істотна ўплываюць на цяперашні і будучы час.

Неацэнную дапамогу ў фарміраванні экспазіцыі аказалі барысаўскія ўніфармісты.

Шлях мецэната

— Ці ёсць сярод сабраных экспанатаў асаблівыя для вас прадметы гонару?

— Так, напрыклад, памятная скрынка з-пад цукерак, якую Наталля Іванаўна цалкам выпадкова купіла ў Анапе. Французскія калекцыянеры падарылі сядзібе шпагу, якая належала барабаншчыку, і бюлетэнь напалеонаўскіх уладаў, які апісваў падзеі пад Кобрынам — ці помніце такі выраз: «Хлусіць як бюлетэнь»? У нашым выпадку каштоўны нават не сам падарунак, а тое, як ён быў зроблены, бо калекцыянер сказаў: «Я думаю, што гэта рэч павінна знаходзіцца ў Беларусі».

Хутка, 30 кастрычніка, споўніцца 160 гадоў з дня нараджэння Івана Каладзеева. Адзначыць гэту дату ў Барысаве збіраюцца без помпы, але з удзелам усіх зацікаўленых: тут пройдуць міжнародны фестываль «Бярэзіна-1812», літаратурныя гасцёўні, каладзееўскія чытанні, рэканструктарская выстаўка адзення, прэзентацыі кніг. А ў пачатку лістапада адбудуцца навукова-практычная канферэнцыя і адкрыццё прадстаўніцтва Расійскага ваенна-гістарычнага таварыства ў Беларусі, куды запросяць прадстаўнікоў райвыканкама, гісторыкаў, краязнаўцаў, спецыялістаў бібліятэкі і музея, уніфармістаў, замежных гасцей.

З Мінска, Полацка, Гомеля, Віцебска, Брэста прыязджаюць людзі і здзіўляюцца: «Якія вы малайцы, што ўсё аднавілі, гэта ж неверагодна цікава!» Насамрэч, я не так высока ацэньваю тое, што зроблена, бо бачу гэта ўжо інакш і адчуваю пастаянную незадаволенасць ад таго, што яшчэ не зроблена: трэба добраўпарадкаваць тэрыторыю, пасадзіць парк, пабудаваць капліцу. Мне цяжка расказваць — хадзіць і махаць рукамі, што яшчэ будзе, лепш зраблю — тады прыязджайце і самі ўсё ўбачыце. Прытым, каб вы ўяўлялі, гэты праект — дарагое задавальненне, за сядзібу мы плацім як юрыдычная асоба «па поўнай праграме» і падаткі на зямлю, на нерухомасць, і тарыфы на газ, электрычнасць... У існуючай заканадаўчай практыцы мецэнацтва будучыні не мае, бо павінна скласціся традыцыя. Вось Каладзееў быў мецэнат: сабраў сваю калекцыю і падарыў дзяржаве, хоць каштавала яна каласальных грошай — узяць адну толькі карту, па якой Напалеон ішоў да Масквы і назад, 100 лістоў за подпісам Банапарта! У савецкі час інстытут мецэнацтва быў страчаны, а сёння толькі пачынае аднаўляцца, і вельмі хацелася б, каб дзяржава ў пэўным сэнсе пайшла насустрач — нават не з пункту гледжання матэрыяльнага, а заканатворчага, каб было дакладнае разуменне далейшага шляху і механізмы ўзаемадзеяння.

— Паралельна з бізнесам вы займаецеся аднаўленнем дома-сядзібы Івана Каладзеева ўжо больш за дзесяць гадоў. Ці можна сказаць, што гэта справа жыцця?

— Не зусім так. Калі табе ўжо шмат гадоў, не хочацца знікаць у гэтым свеце бясследна. І вось калі пачынаеш мысліць гэтымі катэгорыямі, то на ўсё знаходзяцца час і сродкі — каб заплаціць за газ, каб пасадзіць дрэвы... Паўстае толькі адно самае важнае пытанне: што далей, як гэта захаваць? Я ўсё зраблю, уладкую ў доме і навокал, аднак дзеці мае наўрад ці працягнуць гэту справу. Тады — як? Каму перадаць, хто будзе адказваць? Механізму пакуль няма...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота аўтара і з адкрытых крыніц.

Больш фота глядзіце на сайце zviazda.by

13-ы бюлетэнь напалеонаўскай арміі ад 14 жніўня 1812-га «Па дарозе з Кобрына ў Дзівін» у 2014 годзе падарылі беларусам сакратар франка-беларускага дзелавога клуба Івон Вожэль і французскі калекцыянер, скульптар Жак Перо.

СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «1000 причин купить HUAWEI»

HUAWEI

Сведения об организаторе – Общество с ограниченной ответственностью «ПРОСПЕКТПРЕСС» (далее – Организатор), УНП 101520868.

Юридический адрес: Республика Беларусь, 220037, г. Минск, пер. Козлова, д. 25, пом. 22.

Срок начала рекламной игры: 10 августа 2019 г.

Срок окончания рекламной игры: 28 октября 2019 г.

Сведения о государственной регистрации рекламной игры: свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3610 от 6 августа 2019 г., выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Сведения о количестве участников рекламной игры: 5743 участника.

Призовой фонд разыгран полностью.

Победители:

1	Кравцова	Виктория	Анатольевна	Денежный приз стоимостью 1 000,00 бел. руб. Денежные средства в размере 129,85 бел. руб.
2	Лосева	Юлия	Олеговна	Денежный приз стоимостью 1 000,00 бел. руб. Денежные средства в размере 129,85 бел. руб.
3	Клепча	Ольга	Владимировна	Денежный приз стоимостью 1 000,00 бел. руб. Денежные средства в размере 129,85 бел. руб.
4	Бурко	Александр	Ефимович	Денежный приз стоимостью 1 000,00 бел. руб. Денежные средства в размере 129,85 бел. руб.
5	Проценко	Андрей	Владимирович	Денежный приз стоимостью 1 000,00 бел. руб. Денежные средства в размере 129,85 бел. руб.
6	Вышедко	Ольга	Сергеевна	Денежный приз стоимостью 1 000,00 бел. руб. Денежные средства в размере 129,85 бел. руб.
